

ЯК КАРЫСТАЦЦА ЛІЧЫЛЬНІКАМІ СВЯТЛА 7

ЧАМУ ХЛУСЯЦЬ ЛЮДЗІ І ЖЫВЁЛЫ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 МАЯ 2023 г. СУБОТА № 90 (29970)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый ЧАБАТАР, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«Толькі паводле нашай інфармацыі з маніторынгу Мінэканомікі, сёлета ў краіне рэалізоўваецца больш як 800 інвестыцыйных вытворчых праектаў. Гэта і мадэрнізацыя дзеючых вытворчасцяў, і стварэнне новых. Выконваецца даручэнне кіраўніка дзяржавы па стварэнні ў кожным раёне як мінімум па адной перспектыўнай вытворчасці. Для гэтага сфарміраваны пералік са 129 праектаў, вызначаны 51 найбольш значны імпартазамяшчальны праект. Бізнес-ініцыятывы з гэтых двух спісаў могуць прэтэндаваць на атрыманне крэдытнай падтрымкі Банка развіцця і банкаў-партнёраў. Адзначу, што гэтыя пералікі могуць дапаўняцца па прапановах аблвыканкамаў».*

# Сімвалы нашай вышыні

*Шаноўныя суайчыннікі!*

**Сардэчна віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.**

**У гэтых сімвалах увасабляецца памяць пакаленняў, адлюстроўваюцца нацыянальная самасвядомасць і няпрость гістарычны шлях народа, звязваюцца разам мінулае, сучаснасць і будучыня беларускай дзяржавы.**

**Нашы сапраўды народныя сцяг, герб і гімн зразумелыя і праўдзівыя, захоўваюць у сабе жыццёвую мудрасць, умацоўваюць духоўныя сілы, натхняюць на новыя здзяйсненні.**

**Імкненне да міру, адданасць роднай зямлі і гатоўнасць ствараць у імя будучых пакаленняў дапамагалі беларусам ва ўсе часы заставацца вернымі сабе і сваім прынцыпам. Упэўнены, гэтыя якасці дазволяць нам не толькі выстаяць перад сённяшнімі выклікамі, але і прымножыць дасягненні суверэннага перыяду.**

**Ад душы жадаю вам, дарагія землякі, сямейнага шчасця, радасці, здароўя і поспехаў у працы на карысць Радзімы.**

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота БелТА.

Напярэдадні Дня Дзяржаўнага сцяга, герба і гімна Дзяржаўны сцяг у выглядзе памятнага знака ўстанавілі на найвышэйшай кропцы Беларусі — гары Дзяржынскай у Дзяржынскім раёне. У цырымоніі адкрыцця кампазіцыі «Сцяг Радзімы» прынялі ўдзел прадстаўнікі Мінаблвыканкама, Дзяржынскага райвыканкама, ваеннага камісарыята Мінскай вобласці, БРСМ, БРПА, іншых грамадскіх арганізацый і ведамстваў, дэлегацыі рэгіёнаў, моладзь, аўтары ідэі ўстаноўкі памятнага знака.

## КОРАТКА

- **Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі ў I квартале вырас на 11,6 працэнта.**
- Агародніннныя культуры ў Беларусі пасеяны амаль на 57 працэнтах запланаванай плошчы.
- **МАЗ прадставіў прадукцыю на машынабудаўнічай выстаўцы ў Казахстане.**
- Беларускія спартсменкі выйгралі 10 медалёў на турніры па жаночай барацьбе ў Бішкеку.
- **Беларуская цэментная кампанія нарасціла адгрузку прадукцыі ў Расію амаль у 4 разы.**

Сацыяльны вектар

# СЯМ'Я ЯК КАШТОЎНАСЦЬ

### Якія меры дзяржаўнай падтрымкі ў гэтым годзе самыя запатрабаваныя

**Што галоўнае ў сямейных адносінах? З такім пытаннем я звярнулася да людзей на вуліцах Мінска. Самы папулярны адказ: «гэта любоў і ўзаемаразуменне». А яшчэ многія дадавалі з усмешкай: «Дзеці — бацькоўская радасць і ўцеха». І з гэтым цяжка не пагадзіцца. Недарэмна кажуць: «Навошта той клад, калі і ў дзетках лад».**

**Разам з тым у нашай краіне ўдзяляецца істотная ўвага і матэрыяльнай падтрымцы сем'яў з дзецьмі. Асаблівым клопатам карыстаюцца шматдзетныя бацькі. Пра самыя запатрабаваныя ў гэтым годзе меры дзяржаўнай падтрымкі, льготы і сацыяльныя гарантыі напярэдадні Дня сям'і расказалі спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

### З нараджэннем другога і наступнага немаўляці памер выплат павялічваецца

У Беларусі расходы дзяржаўнага бюджэту на меры сацыяльнай абароны сем'яў з дзецьмі штогод перавышаюць тры працэнты ВУП. У прыватнасці, сёлета на сістэму дзяржаўных дапамог выдзелена Br3,5 млрд, з іх большая палова — Br2 млрд — прадугледжана толькі на выплату дапамог па доглядзе дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. «Выплатамі на сёння ахоплены амаль 400 тысяч дзяцей (кожнае чацвёртае дзіця ў краіне), з іх 220 тысяч — хлопчыкі і дзяўчынкі да трох гадоў», — адзначыў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Вопыт Беларусі будзе цікавы і карысны»

**Запрашэнне ў адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ад Генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша прыняць удзел у саміце па Мэтах устойлівага развіцця (МУР) атрымана. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.**

Саміт адбудзецца ў верасні 2023 года. *«На паўдарозе да ажыццяўлення Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года настаў час глянуць фактам у твар. Без рэзкага павелічэння абавязацельстваў, салідарнасці іператваральных дзеянняў мы ўпусцім галоўныя мэты Парадку дня на перыяд да 2030 года па выкараненні галечы, скарачэнні няроўнасці і абароне навакольнага асяроддзя,* — гаворыцца ў пісьме ад Генеральнага сакратара ААН. — *Я разлічваю на вашу падтрымку ў забеспячэнні прарываў, у якіх адчайна мае патрэбу наш свет».*

Антоніу Гутэрыш адзначае, што шматлікія крызісы апошніх трох гадоў нанеслі сур'ёзны ўдар па намаганнях, накіраваных на выкананне МУР. Тым не менш прадугледжаныя пераўтварэнні застаюцца магчымымі і неабходнымі.

*«Саміт па МУР стане цэнтральным элементам шэрагу мерапрыемстваў, уключаючы саміт па клімаце, дыялог высокага ўзроўню па пытаннях фінансавання развіцця, серыю нарад па пытаннях аховы здароўя і міністэрскую сустрэчу ў рамках падрыхтоўкі да саміту будучага 2024 года. Саміт па МУР можа стаць момантам, калі наш свет пяройдзе ад страху да надзеі і ад паглыблення песімізму да паскарэння дзеянняў. Я з нецярплівасцю чакаю вашага асабістага ўдзелу ў саміце і вашага ўкладу ў тое, каб ён стаў паваротным момантам для МУР»,* — адзначыў Генеральны сакратар ААН.

Аляксандр Лукашэнка накіраваў Антоніу Гутэрышу пісьмо ў адказ.

*«Мінск у поўнай меры вітае гэту ініцыятыву. Лічым, што будучае мерапрыемства — добрая магчымасць падвесці прамежкавыя вынікі нашых агульных намаганняў. Рэспубліка Беларусь цалкам прыхільная да дасягнення Мэт устойлівага развіцця, яны эфектыўна інтэграваны ў нашы нацыянальныя стратэгічныя дакументы».*

*«Перакананы, што вопыт Беларусі па эфектыўнай арганізацыі работы на нацыянальным узроўні ў справе дасягнення Мэт устойлівага развіцця будзе цікавы і карысны для многіх іншых дзяржаў — членаў ААН. Мы, безумоўна, гатовы падзяліцца ім у ходзе правядзення саміту».*

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў важнасць таго, каб саміт стаў крыніцай ідэй і ініцыятыў, што садзейнічаюць ліквідаванню праблем на шляху дасягнення МУР: *«Вы зусім правільна адзначылі, што «шматлікія крызісы апошніх трох гадоў нанеслі сур'ёзны ўдар па намаганнях, накіраваных на выкананне Парадку дня — 2030». Сёння цалкам відавочна, што без міру не можа быць устойлівага развіцця на планеце. Я вымавіў гэтыя словы яшчэ ў 2015 годзе, выступаючы на Саміце ААН, на якім былі прыняты Мэты ўстойлівага развіцця. Вамі таксама неаднаразова агучвалася падобная думка».*

*«Гісторыя Беларусі прасякнута сумнымі ўспамінамі аб вайне. І таму мы вельмі даражым мірам не толькі на сваёй зямлі, але і ў рэгіянальным і глабальным маштабах. На працягу шэрагу апошніх гадоў мы актыўна заклікаем усе дзяржавы да ўсёабдымнага дыялогу па бяспецы ў мэтах фарміравання асноў пабудовы новага, справядлівага сусветнага парадку. Няўжо для таго, каб да нас нарэшце прыслухаліся, павінна адбыцца глабальная катастрофа, якая забярэ жыцці мільёнаў людзей? На фоне геапалітычнага процістаяння на планеце, якое расце, дыялог у сапраўдным духу Сан-Францыска сёння запатрабаваны як ніколі з часоў заканчэння халоднай вайны».*

Прэзідэнт падкрэсліў, што будучы саміт павінен выразна акрэсліць узаемасувязь паміж светам і ўстойлівым развіццём і тым самым даць імпульс да пачатку глабальнага дыялогу па бяспецы.

*«Сур'ёзным выклікам для агульнай справы — дасягнення Мэт устойлівага развіцця — з'яўляюцца аднабаковыя прымусовыя меры, або санкцыі. Гэтыя валюнтарысцкія і супярэчныя міжнароднаму праву дзеянні абмежаванай сваімі інтарэсамі і прадузятымі думкамі групы заходніх дзяржаў знішчаюць непасрэдна прагрэс у дасягненні МУР. Як можна, напрыклад, ліквідаваць галечу і голад, калі санкцыі падрываюць глабальную харчовую бяспеку і, такім чынам, павялічваюць маштабы галечы і голаду да цэлых рэгіёнаў і нават кантынентаў? Санкцыі сталі зброяй. Яны здольны забіваць!»*

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў Генеральнаму сакратару ААН за запрашэнне на саміт і запэўніў, што Беларусь будзе актыўна садзейнічаць яго падрыхтоўцы і прыме ўдзел у гэтым важным мерапрыемстве на дастойным узроўні.

Грамадская думка

# Сцяг, герб і гімн — нацыянальныя сімвалы Беларусі

**14 мая беларусы святкуюць Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Свята, якім ушаноўваюцца ўсе тры сімвалы беларускай дзяржаўнасці (уключаючы гімн), сёлета адзначаецца ўпершыню — адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў у красавіку. Сімвалічна, што менавіта 14 мая 1995 года, падчас першага рэферэндуму ў краіне, абсалютная большасць нашых суайчыннікаў прагаласавала за той сцяг і герб, з якімі сёння атаясамліваецца беларуская дзяржаўнасць.**

Як паказалі вынікі сацыялагічнага даследавання, якое нядаўна праводзіў Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі, дзве трэці насельніцтва нашай краіны (66,7 %) галоўнымі нацыянальнымі сімваламі Беларусі лічаць дзяржаўную сімволіку — сцяг, герб і гімн. Прычым значнасць дзяржаўных сімвалаў сярод моладзі вышэйшая (65,9 %), чым у беларусаў сярэдняга ўзросту (61,4 %).

Апытанне праводзілася ва ўсіх абласных цэнтрах і ў Мінску, асобных раённых гарадах і сельскіх населеных пунктах. На пытанні адказвалі 1848 рэспандэнтаў.

Паводле сацдаследавання, станоўчыя адносіны да дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь адзначаюцца ў большасці апытаных (80,5 %). Гэта сведчыць аб тым, што сімвалы нашай краіны з'яўляюцца народнымі. У свядомасці грамадзян дзяржаўная сімволіка адлюстроўвае нацыянальны характар і імкненні беларускага народа. Канцэптуальнай асновай беларускай дзяржаўнасці выступаюць яе знакавыя структурныя элементы. Рэспандэнты вызначылі, што асноўнымі атрыбутамі беларускай дзяржаўнасці з'яўляюцца перш за ўсё герб (61 %), сцяг (57,8 %), Канстытуцыя (50,8 %) і гімн Беларусі (49 %).

Падчас даследавання рэспандэнтам было прапанавана адказаць на пытанне: «Што для вас азначае быць патрыётам Беларусі?». 35,7 % удзельнікаў апытання адзначылі неабходнасць «паважаць дзяржаўную сімволіку і гісторыю Беларусі».




**Вераніка КАНЮТА.**

Нагода

# У эпіцэнтры — бізнес-лэдзі

## Першы рэспубліканскі форум жанчын-прадпрымальніц «Энергія і стваральная праца» праходзіць у Мінску

**У ім удзельнічае 280 бізнес-лэдзі з усёй краіны. Некаторыя жанчыны толькі пачынаюць шлях у прадпрымальніцтве, іншыя ўжо маюць багаты досвед, якім гатовы дзяліцца са сваімі калегамі-пачаткоўцамі. У форуме прымаюць удзел і прадстаўнікі Саюза жанчын Расіі.**

Выдатную пляцоўку для абмену вопытам і агучвання праблемных момантаў у бізнес-асяроддзі ім даў Беларускі саюз жанчын пры падтрымцы Савета Рэспублікі. На працягу двух дзён у Нацыянальнай бібліятэцы і гасцініцы «Вікторыя» для жанчын сферы бізнесу арганізаваны шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку дыялогавая пляцоўкі з прадстаўнікамі профільных міністэрстваў, якія сярод іншага займаюцца і пытаннямі прадпрымальніцтва.

Як адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**, форма правядзення такіх мерапрыемстваў, як жаночыя форумы, у нас ужо ўсталявалася. «Гэта такая слаўная, добрая традыцыя, — заўважыла яна. — Вельмі важна, што па ініцыятыве Беларускага саюза жанчын збіраюцца цяпер жанчыны нават па галіновым прынцыпе. Гэта таксама цудоўна». У сувязі з гэтым спікер верхняй палаты парламента нагадала пра форум працаўніц сяла, які адбыўся восенню мінулага года.

Кажучы пра форум жанчын-прадпрымальніц, Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што перш за ўсё гэта знаёмства з людзьмі і той працай, якой займаюцца жанчыны. Гэта, па яе словах, і выпрацоўка прапаноў, ідэй, якія знаходзяць потым увасабленне. «Асаблівa гэта важна для нас, заканадаўцаў, — звярнула ўвагу спікер. — Калі мы чуем прапановы, якія паступаюць ад нашых жанчын, мы абавязкова іх рэалізоўваем у тых законапраектах, над якімі працуем у Савеце Рэспублікі».

Наталля Качанава падкрэсліла, што ў нашай краіне да жанчын асаблівае стаўленне. «Наша сацыяльна арыентаваная дзяржава і палітыка, якая праводзіцца ў краіне, накіравана на падтрымку жанчын, — адзначыла спікер. — Прадпрымальніцтва — гэта няпростая ноша. А жанчына, калі яшчэ займаецца прадпрымальніцтвам, — гэта не проста жанчына-маці, жанчына-дачка, жанчына — захавальніца сямейнага ачага, але яшчэ і жанчына, якая сваім розумам, талентам робіць усё для таго, каб не проста стварыць нейкія даброты для сваёй сям'і, але яшчэ працуе на карысць краіны, яе эканомікі».

Жаночае прадпрымальніцтва ў Беларусі набірае абароты. Калі ў 2021 годзе бізнесам займалася 68 тысяч жанчын, то ў 2022 годзе бізнес-лэдзі стала 74,5 тысячы. Як звярнула ўвагу спікер верхняй палаты парламента, малы і сярэдні бізнес складае трэцюю частку эканомікі нашай краіны. «Дзяржава ўсяляк падтрымлівае развіццё прадпрымальніцтва, — заявіла Наталля Качанава. — Але і нізкі паклон жанчынам, якія займаюцца гэтай няпростай працай — прадпрымальніцтвам. Трэба несці адказнасць за тую справу, якой займаешся. Тое, чым ты займаешся, павінна знайсці сваю далейшую рэалізацыю: ці гэта паслугі, ці вытворчасць. Гэтым займаюцца жанчыны, якія ўмеюць браць на сябе адказнасць і прымаць такія сур'ёзныя рашэнні ў сваім жыцці».

**Старшыня Беларускага саюза жанчын Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** расказала ўдзельніцам форуму аб асноўных задачах грамадскага аб'яднання. Яна паведаміла, што на цяперашні момант арганізацыя аб'ядноўвае больш за 162 тысячы 560 самых актыўных жанчын краіны, якія з'яўляюцца членамі амаль шасці тысяч пярвічных арганізацый па ўсёй Беларусі, і колькасць іх з кожным днём расце.

Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольгі ЧАМАДАНАВАЙ**, у Мінскай гарадской арганізацыі БСЖ, якую яна ўзначальвае, ужо створана пярвічка жанчын-прадпрымальніц. «Радуе тое, што з кожным днём нас становіцца больш, — падзялілася яна. — Жанчыны аб'ядноўваюцца, ёсць агульныя інтарэсы. Самае галоўнае, што ўсе яны накіраваны на стваральную працу, на адзінства выканання тых задач, якія сёння перад намі стаяць на карысць нашай краіны, нашага горада».

Па словах Вольгі Чамаданавай, жанчыны бізнесу зацікаўлены ў тым, каб працаваць усім разам у адной камандзе. «Не сумняваюся, што першы рэспубліканскі форум, які праводзіцца ў горадзе Мінску, будзе стартавы, знакавы і прыцягне ўвагу многіх жанчын, якія сёння не тут, не з намі, — перакананa начальнік галоўнага ўпраўлення. — Абавязкова ў іх з'явіцца жаданне сустракацца і яшчэ больш ствараць тыя спрыяльныя ўмовы для таго, каб наша краіна была моцная ў жаночым руху і ў многім мела поспех».

**Вераніка КАНЮТА.**

Лічбавы свет

# Кіберімунітэт ад кібератак

## Яўген Касперскі расказаў студэнтам, як засцерагчы лічбавую будучыню ад небяспекі

**Доўгі час чалавецтва жыло ў каменнай эры, потым — у жалезнай, цяпер мы, як лічаць эксперты, існуем у пластыкавай рэальнасці і непазбежна імкнёмся ў лічбавае стагоддзе. Аднак, каб чалавецтва туды трапіла, яму трэба пераадолець вялізныя кіберперашкоды і атрымаць кіберімунітэт. Як перайсці ў лічбавы свет бяспечна і існаваць у ім, на сустрэчы са студэнтамі і кіраўніцтвам ВНУ Беларусі, якая была арганізавана Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры Прэзідэнце і Мінадукацыі, расказаў генеральны дырэктар таварыства «Лабараторыя Касперскага» Яўген КАСПЕРСКІ.**



### Абарона прыватнасці і кантроль анамальных паводзін

Задачы забеспячэння кібербяспекі не столькі прагрмісцкія, колькі матэматычныя, навуковыя. Сучасны свет увесь час вымушаны абараняцца ад кіберпагроз, таму ўменне і разуменне, як захаваць сябе і сваю інфармацыю, вельмі важнае, падкрэсліў спікер:

— Кіберзлачыннасць становіцца ўсё больш масавай. Разам з павелічэннем колькасці разумных прылад расце і колькасць уразлівасцяў. Кожны дзень мы збіраем мільёны падазроных файлаў, з якіх штодня фіксуем каля 400 тысяч новых унікальных, раней невядомых шкодных траянскіх файлаў. Злачынцы становяцца ўсё больш прафесійнымі, яны аб'ядноўваюцца ў прафесійныя кібербанды, якія распрацоўваюць метады кібератак.

Каб апрацоўваць такі паток інфармацыі, у лабараторыі існуюць аўтаматычныя сістэмы збору інфармацыі і некалькі ўзроўняў сістэм распазнавання (у асноўным, гэта машыннае навучанне), якія вызначаюць, які перад імі файл: добры, кепскі, сапсаваны. Сучасная абарона ад кіберзлачынства — гэта ўжо не проста антывірус, а гэткі шматузроўневы камбайн, які абараняе ад шматлікіх пагроз, у тым ліку ахоўвае прыватнасць, расказаў Яўген Касперскі:

— Гэта кантроль уцечак інфармацыі аб вашых асабістых справах: кантроль пароляў, ідэнтыфікацыі і іншага. Часам змагацца прыходзіцца не толькі ў сеціве, але і ў рэальнасці, бо нашых экспертаў выклікаюць на затрыманне, каб яны дапамаглі разабрацца, што менавіта трэба апісваць.

Каб тэхнічна абараняць сеткі ад прафесійных хакерскіх атак, існуюць шматузроўневыя сістэмы абароны. Гэта кантроль сеціва, пошты, інтэрнэт-трафіка і анамальных паводзін у сеціве. З дапамогай апошняга, дарэчы, можна злавіць выключна складаныя кібератакі, удакладніў эксперт.

### Крыптаграфічныя і імунныя сістэмы для крытычнай інфраструктуры

Хакеры пачынаюць падрываць інфраструктуру, у тым ліку крытычную. Пад пагрозай аказваюцца кампаніі, арганізацыі, бізнесы, ваенныя, дзяржавы — тыя структуры, адкуль можна сабраць шмат грошай за адзін узлом. Зламыснікі ўмудраюцца дыстанцыйна кіраваць транспартам, могуць атрымліваць доступ да канфідэнцыяльных даных і праваахоўных прастоі ў вытворчасці. Заснавальнік кампаніі падкрэсліў, што катастрафічна не хапае абаронцаў у сферы бяспекі прамысловых аб'ектаў:

— Праблема абароны крытычнай інфраструктуры не вырашаецца сістэмамі бяспекі. Для гэтага неабходна імунная аперацыйная сістэма, дзе не патрэбны антывірус, — яна абаронена сама па сабе. Сама яе архітэктура гарантуе, што ўзламаць яе немагчыма, і кожны элемент сістэмы працуе ва ўласным дамене бяспекі. Нават калі хакнуць адзін яе модуль, далей кіберзлачынца прасунуцца не зможа. Сутнасць канцэпцыі кіберімунітэту ў забеспячэнні такога ўзроўню абароны, пры якім кошт кібератакі на арганізацыю перавышае суму магчымага ўрону.

Беларускі рынак цікавіць кампанію не толькі як месца для рэалізацыі сваёй прадукцыі, але і як краіна з высокакваліфікаванымі кадрамі ў галіне кібербяспекі. На сустрэчу з мэтрам інтэрнэт-бяспекі прыйшлі студэнты, якія пераважна і займаюцца распрацоўкай метадаў абароны інфармацыі, таму для іх такі досвед стаўся вельмі карысным, сведчаць яны.

— Лабараторыя Касперскага — найбольш вядомая IT-кампанія ў сферы камп'ютарнай бяспекі, і для нас сустрэча з яе кіраўніком — вельмі важны вопыт, таму што мы можам атрымаць веды ад спецыяліста найвышэйшага класа і выкарыстаць яго ў нашым навучанні, — лічыць **Антон ШКОР, студэнт факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ**, спецыялізацыя якога — якраз камп'ютарная бяспека.

Па дадатковыя веды на сустрэчу прыйшоў і **Багдан САЛАЎЁЎ, студэнт факультэта інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі БНТУ**, які лічыць, што інфармацыя павінна мець шыфраванне, таму новыя сістэмы яе абароны важныя і для студэнтаў іншых спецыяльнасцяў, а не толькі кібербяспекі.

Унікальнай і знакавай ахарактарызаваў сустрэчу кіраўніка «Лабараторыі Касперскага» са студэнтамі **Юрый АРЛОВІЧ, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ:**

— На нашым факультэце мы даўно рыхтуем спецыялістаў у галіне камп'ютарнай бяспекі, якія звязаны найперш з крыптаграфічнымі метадамі абароны інфармацыі. А сёлета на факультэце адкрываецца новая спецыяльнасць — «кібербяспека», прыярытэтная задача якой — абарона электронных і фізічных актываў прадпрыемстваў ад несанкцыянаванага электроннага доступу.

Навукоўцы плануюць развіць работу з крыптаграфічнымі сістэмамі абароны інфармацыі ў напрамак, звязаны з апрацоўкай кіберпагроз і маніторынгам кібератак. А яшчэ — працягнуць праграмы супрацоўніцтва з кампаніяй, якія распачаліся яшчэ ў 2012-м і былі звязаны з навучаннем студэнтаў у межах акадэміі Касперскага і абменам вопытам у сферы інфармацыйнай бяспекі.

Яўген Касперскі падкрэсліў, што быў бы вельмі рады супрацоўнічаць з беларускімі навукоўцамі і айцішнікамі ў сферы распрацоўкі праграм, збудаваных на аснове імуннай аперацыйнай сістэмы, бо за гэтым будучыня.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Маладыя прафесіяналы

# Убачыць спецыфіку прафесіі на свае вочы...

**49 прафесійных кампетэнцый (з іх сем — для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця), больш як 350 канкурсантаў, у тым ліку з Расійскай Федэрацыі і Казахстана, каля 300 экспертаў з кола педагагічных работнікаў і прадстаўнікоў прадпрыемстваў... Вось толькі некаторыя факты пра V Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства «ProfSkills Belarus 2023», які ўрачыста адкрыецца сёння ў сталічным спартыўна-забаўляльным комплексе Falcon Club. На два дні (14 і 15 мая) Футбольны манеж у Мінску пераўтворыцца ў прэзентацыйную пляцоўку для прадстаўнікоў розных прафесій.**



У рамках конкурснай праграмы пройдуць спаборніцтвы па прафесійных кампетэнцыях у такіх галінах, як будаўніцтва і будаўнічыя тэхналогіі, інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі, творчыя прафесіі і мода, вытворчасць і інжынерныя тэхналогіі, транспарт і лагістыка, сацыяльныя і персанальныя паслугі і г. д. Удзельнікамі рэспубліканскага фіналу з'яўляюцца маладыя людзі ва ўзросце да 22 гадоў (па некаторых кампетэнцыях — да 24 гадоў): прадстаўнікі каледжаў і вышэйшых навучальных устаноў.

— Спаборніцтвы праводзяцца не дзеля саміх спаборніцтваў. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб павысіць прэстыж рабочых прафесій сярод моладзі і спрыяць распаўсюджванню міжнародных прафесійных стандартаў, — падкрэслівае **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ.** — Работадаўцы павінны быць у шчыльнай завязцы з тымі, хто рыхтуе для іх кадры, удзельнічаць у фарміраванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі. Для таго каб выпускаць канкурэнтаздольную на знешніх рынках прадукцыю, патрабуюцца не толькі сучасныя тэхналогіі, але і спецыялісты самай высокай кваліфікацыі, якія змогуць працаваць на сучасным абсталяванні. Усе разумеюць, што з ростам складанасці працы ўзнікае патрэба ў рабочых з больш высокай кваліфікацыяй, гэта міжнародны трэнд. У апошнія гады стандарты прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі істотна змяніліся. Патрабаванні да рабочых спецыяльнасцяў сур'ёзна адрозніваюцца ад тых, што былі, скажам, дзесяць гадоў таму. Сучасны рабочы — гэта эрудзіраваны, высокакваліфікаваны спецыяліст, які, акрамя прафесійных ведаў, павінен валодаць спецыфічнымі навыкамі ў сумежных галінах, у тым ліку разбірацца ў інфармацыйных тэхналогіях, робататэхніцы і г. д. Такіх спецыялістаў толькі з вялікай нацяжкай можна назваць рабочымі ў звыклым разуменні гэтага слова. Шэраг рабочых прафесій патрабуе цяпер наяўнасці сярэдняй спецыяльнай адукацыі. А конкурс — гэта эфектыўны інструмент абнаўлення зместу падрыхтоўкі кадраў.

Калі мы аналізуем узровень складанасці заданняў на міжнародных чэмпіянатах, звяраем гадзіннікі з нашымі сацыяльнымі партнёрамі, адбываецца шчыльнае ўзаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі. Яны ўнікаюць у змест заданняў, глядзяць, што могуць укараняць у сябе на вытворчасці. Таксама нацыянальны чэмпіянат — гэта і дэманстрацыя найноўшых тэхналогій на вытворчасці і ў рэальным сектары эканомікі.

Арганізатарамі конкурсу прафесійнага майстэрства выступаюць Міністэрства адукацыі і Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі, а партнёрамі — айчынныя і замежныя вытворцы і пастаўшчыкі абсталявання, матэрыялаў і інструмента. У ліку партнёраў конкурсу — шэраг флагманаў айчыннай эканомікі: «Гомсельмаш», Мінскі трактарны завод, «Планар», «Пеленг», Мінскі завод колавых цягачоў, «Прыёрбанк», «Керамін», «Элема», «Магатэкс», «Інтэграл», «Камунарка», «Барысаўдрэў», Мінскі завод шасцерняў, «Мінскхлебпрам» і многія іншыя.

**«Яшчэ адна найважнейшая задача чэмпіянату — ранняя прафарыентацыя школьнікаў,** — паведаміў Валерый Галубоўскі. — Таму запрашаем бацькоў са сваімі дзецьмі ў выхадны дзень наведаць конкурсныя пляцоўкі, каб пазнаёміцца бліжэй з сутнасцю і зместам той ці іншай прафесіі. Рэспубліканскі конкурс — гэта сапраўднае свята прафесій! Валанцёры будуць знаёміць гасцей падрабязна з кожнай кампетэнцыяй... Прычым разуменне прафесіі будзе фарміравацца не толькі па апісанні, а яе спецыфіку можна будзе ўбачыць на свае вочы. **Выбар прафесійнай адукацыі — гэта эфектыўны старт у будучыню. Хацелася б, каб тое ўсведамляла грамадства і бацькі, якія ўплываюць на выбар дзецьмі прафесіі.** Дарэчы, менавіта ў рамках гэтага конкурсу нарадзілася новая спецыяльнасць «Фларыстычны дызайн». Такая кампетэнцыя была прадстаўлена яшчэ на першых конкурсах, а сёлета ў Мінскім дзяржаўным каледжы рамесніцтва і дызайну імя М. Кедышкі распачнецца падрыхтоўка фларыстаў».

Удзельнікі конкурсу, якія зоймуць прызавыя месцы, будуць узнагароджаны медалямі, дыпломамі і грашовымі прызамі. Акрамя гэтага, пераможцы і прызёры конкурсных кампетэнцый атрымаюць льготы пры паступленні ў профільныя ВНУ або пры пераходзе на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі, калі навучаюцца цяпер ва ўстанове прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Найлепшыя будуць уключаны ў склад нацыянальнай зборнай па прафесійным майстэрстве і змогуць прадставіць нашу краіну на міжнародным узроўні.

У рамках V Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства «ProfSkills Belarus 2023» прадугледжана і насычаная дзелавая праграма: запланаваны дыялогавыя пляцоўкі па актуальных тэмах сферы адукацыі: «Новыя механізмы ўзаемадзеяння бізнесу і адукацыі», «Адукацыйная прастора: новыя задачы і прыярытэты развіцця», «Лічбавізацыя сістэмы прафесійнай адукацыі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# СЯМ'Я ЯК КАШТОЎНАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Намеснік міністра нагадаў памеры дапамог, пры гэтым падкрэсліў, што яны значныя. «Аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці складае Br3,5 тыс., пры нараджэнні другога і наступнага — амаль Br5 тыс. Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці да трох гадоў складае Br606, а калі ў сям'і выхоўваецца другое і наступнае дзіця — то ўжо Br690». Дарэчы, Беларусь — адна з нямногіх краін, дзе ў адпачынку па доглядзе дзіцяці можна знаходзіцца да трох гадоў і атрымліваць увесь гэты час дапамогу. Больш за тое, ёсць магчымасць працаваць на палову стаўкі і атрымліваць гэту выплату ў поўным памеры.

«Сродкі, якія выдзяляюцца, значныя не толькі для дзяржаўнага бюджэту, але і для кожнай асобна ўзятай сям'і, — дадала **начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.** — Напрыклад, сацыяльны бюджэт пары ў першыя 12 месяцаў пасля нараджэння першынца сумарна складае каля Br15 тыс. Пры нараджэнні другога дзіцяці сумарны памер штомесячных дапамог пераўзыходзіць Br860, што ў 1,5 раза вышэй за мінімальную заработную плату ў краіне.

Сем'і з дзецьмі з'яўляюцца таксама асноўнымі атрымальнікамі штомесячнай і аднаразовай сацыяльных дапамог. Пры гэтым для шматдзетных дзейнічаюць ільготныя ўмовы прадстаўлення штомесячнай сацыяльнай дапамогі. Крытэрыі патрэбы для іх складаюць 115 працэнтаў, для іншых сем'яў — 100 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму. У мінулым годзе штомесячную сацыяльную дапамогу атрымалі больш як 50 тыс. чалавек з катэгорыі шматдзетных сем'яў».

## «Сямейны капітал» датэрмінова выкарыстоўваюць на жыллё

Яшчэ адной важнай і вельмі затратнай для дзяржаўнага бюджэту мерай падтрымкі шматдзетных сем'яў з'яўляецца праграма сямейнага капіталу, якая рэалізоўваецца ў краіне з 2015 года пры нараджэнні трэцяга або наступнага дзіцяці. З 1 студзеня 2023 года яго памер складае амаль Br30 тыс. За больш як восем гадоў рэалізацыі гэтай праграмы 126 тыс. сем'яў адкрылі дэпазітныя рахункі, на якія залічана амаль $826 млн і больш як Br1 млрд. Толькі сёлета ўжо адкрыта больш як 4 тыс. дэпазітаў. «Праграма запатрабавана сярод шматдзетных сем'яў, больш як 68 тыс. з іх ужо скарысталіся правам датэрміновага распараджэння сродкамі. Практычна 83 працэнты выкарыстоўваюць сямейны капітал на вырашэнне сваіх жыллёвых пытанняў. Пры гэтым у апошнія гады мы назіраем усё большую патрэбу выкарыстання сямейнага капіталу на адукацыйныя (7 %) і медыцынскія паслугі (10 %). У 2023 годзе на праграму сямейнага капіталу ў рэспубліканскім бюджэце запланавана Br430 млн», — адзначыла Святлана Белаш.

Вырашэнне жыллёвага пытання з'яўляецца бадай што самым актуальным для маладых і шматдзетных сем'яў. І тут дзяржава таксама аказвае істотную фінансавую падтрымку. «Льготны крэдыт выдаецца шматдзетнай сям'і пад 1 % гадавых на 40 гадоў, — нагадаў Валерый Кавалькоў. — Пры гэтым для сем'яў з трыма дзецьмі дзяржава пагашае 75 % ад сумы запазычанасці. Для сем'яў з чатырма і больш дзецьмі сума запазычанасці пакрываецца дзяржавай поўнасцю. І яшчэ адзін механізм — дзяржаўная бязвыплатная субсідыя на пагашэнне асноўнага доўгу па камерцыйных крэдытах і выплата часткі працэнтаў па такіх крэдытах. Сям'і з трыма дзецьмі субсідыя на пагашэнне асноўнага доўгу выстаўляецца ў памеры 90 % ад сумы асноўнага доўгу. Калі ў сям'і выхоўваюцца чатыры і больш дзяцей, сума субсідый ужо 100 %. Тобок, шматдзетныя сем'і фактычна забяспечваюцца жыллём за кошт дзяржаўных сродкаў».



За мінулы год атрымалі жыллё і тым самым палепшылі свае жыллёвыя ўмовы больш за 11 тысяч шматдзетных сем'яў. «Сёлета, у прыватнасці, у сталіцы даведзена накіраваць на паляпшэнне жыллёвых умоў 1000 шматдзетных сем'яў, — адзначыла **намеснік начальніка аддзела прававога рэгулявання і рэалізацыі жыллёвай палітыкі ўпраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Таццяна БУХТА.** — Па стане на канец красавіка ўжо 320 з іх атрымалі магчымасць палепшыць свае жыллёвыя ўмовы. Большасць сем'яў накіроўваюцца на будаўніцтва жылля ў Мінску, сярод аб'ектаў, якія цяпер размяркоўваюцца, — шматкватэрныя жылыя дамы, якія знаходзяцца ў граніцах вуліц Ангарская — Магнітная і ў граніцы вуліцы Малініна, што ў мікрараёне Серабранка. Паколькі Мінск вельмі запатрабаваны ў плане квадратных метраў, адным з дастаткова добрых варыянтаў з'яўляецца паляпшэнне сваіх жыллёвых умоў у гарадах-спадарожніках. Цяпер развіваецца будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў у Смалявічах з прадстаўленнем абавязковай дзяржаўнай падтрымкі. Неблагі варыянт — будаўніцтва жылых памяшканняў у населеных пунктах з колькасцю да 20 тысяч жыхароў. Нядаўна сярод такіх прапаноў быў Лагойск. І адна шматдзетная сям'я з Мінска скарысталася гэтым варыянтам таксама з прадстаўленнем дзяржаўнай падтрымкі».

## Паслугі нянькі і сацыяльная перадышка

Падтрымка дзяржавы сем'яў з дзецьмі вымяраецца не толькі прамымі матэрыяльнымі выплатамі. У тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва прадстаўляюцца розныя паслугі — нянькі, сацыяльны патранат, сацыяльная перадышка. У прыватнасці, паводле слоў Святланы Белаш, паслугі кароткачасовага догляду дзяцей — гэта паслугі нянькі — у 2022 годзе бясплатна атрымалі 2,5 тыс. сем'яў, з іх 1,6 тыс. сем'яў, дзе выхоўваюцца двайняты або трайняты, 770 сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, і 18 сем'яў, дзе бацькі з'яўляюцца інвалідамі 1 або 2 групы.

«З канца мінулага года ў трох раёнах вобласці — Мінскім, Маладзечанскім і Вілейскім — запушчаны пілотны праект па прадстаўленні дадатковых паслуг нянькі на платнай аснове. Кошт паслугі вагаецца ад 4,27 рубля да 5,32 рубля за гадзіну, — дадала **начальнік аддзела дзяржаўнай падтрымкі сям'і ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі і сацыяльнага абслугоўвання камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Зоя КАНОПЛІНА.** — Мы пакуль вывучаем патрэбу. Мяркуем, паслуга можа быць запатрабавана сярод маці, якія выходзяць на працу датэрмінова, да заканчэння дэкрэтнага адпачынку, а пакінуць дзіця няма з кім. Альбо ў сем'ях, дзе выхоўваюцца два дзіцяці-інваліды: 20 бясплатных гадзін у тыдзень ім недастаткова, тады яны могуць звяртацца па платную няньку звышнарматывы. Калі паслуга будзе запатрабавана, то распаўсюдзім на іншыя рэгіёны вобласці».

Карыстаецца попытам і паслуга сацыяльнай перадышкі для бацькоў з дзецьмі-інвалідамі ва ўзросце ад 4 да 18 гадоў, якую прадстаўляюць дзіцячыя дамы-інтэрнаты. Яна прадугледжвае кароткачасовае вызваленне бацькоў ад догляду дзіцяці з інваліднасцю — гэта да 56 дзён у календарным годзе. У гэты час яны могуць адпачыць, аднавіць свае сілы або вырашыць нейкія важныя сямейныя справы. «Паслуга перадышкі аказваецца бясплатна, бацькі аплачваюць толькі кошт харчавання дзіцяці, — удакладніла Святлана Белаш. — Пры гэтым, аддаючы дзіця ў дзіцячы дом-інтэрнат на кароткі перыяд, сям'я не пазбаўляецца сацыяльных выплат на дзіця (пенсія па інваліднасці, дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда і іншыя выплаты на дзяцей у сям'і, а таксама льготы, якія прадугледжаны заканадаўствам для такіх сем'яў, — усё захоўваецца). У 2022 годзе паслугу сацыяльнай перадышкі атрымалі 106 сем'яў, гэта на 60 працэнтаў больш, чым у 2021 годзе. Акрамя таго, на аказанне падтрымкі ў наладжванні сямейных і дзіцяча-бацькоўскіх адносін накіраваны такія праекты тэрытарыяльных цэнтраў, як «Тата-школа», «Майстэрства быць маці», «Сям'я як каштоўнасць».

## Дадатковы выхадны і іншыя гарантыі бацькам, якія працуюць

Таксама ў Беларусі дзейнічае даволі развіты механізм дзяржаўнай падтрымкі бацькоў, якія працуюць, — гэта гарантыі Працоўнага кодэкса, якія з'яўляюцца абавязковымі для выканання ўсімі наймальнікамі. «Напрыклад, пры прыёме на работу забараняецца адмаўляць жанчынам у заключэнні працоўнага дагавора або зніжаць заработную плату па матывах цяжарнасці або наяўнасці дзяцей да трох гадоў. Гэта правіла таксама распаўсюджваецца і на адзінокіх бацькоў з дзецьмі ва ўзросце да 14 гадоў або з дзецьмі-інвалідамі да 18 гадоў. Шэраг гарантый па абароне занятасці дзейнічае для бацькоў, якія знаходзяцца ў водпуску па цяжарнасці і родах або ў водпуску па доглядзе дзіцяці. На перыяд знаходжання ў такіх водпусках за імі захоўваецца рабочае месца. Больш за тое, пасля заканчэння водпуску па доглядзе дзіцяці наймальнік абавязаны прадоўжыць кантракт са згоды работніка (маці або бацькі), пакуль дзіця не дасягне ўзросту пяці гадоў. Бацькі валодаюць і своеасаблівым імунітэтам пры звальненні, напрыклад, гарантуецца недапушчэнне скасавання працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка з цяжарнай жанчынай або адзінокім бацькам, які выхоўвае дзіця да трох гадоў.

Таксама шэраг гарантый улічвае патрэба бацькоў у свабодным часе для вырашэння пытанняў дзіцяці. Размова ідзе аб дадатковых, свабодных ад работы днях. У прыватнасці, бацькі, якія выхоўваюць дваіх дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, маюць права на адзін дадатковы выхадны дзень у месяц. Яго аплата можа прадугледжвацца ў калектыўным дагаворы ці ў іншым лакальным прававым акце.

Сёння бацькі, якія выхоўваюць дзіця з інваліднасцю, маюць права атрымаць адзін свабодны ад работы дзень у месяц, які аплачваецца за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання, незалежна ад умоў занятасці. Шматдзетным бацькам, у якіх трое і больш дзяцей, або бацькам, якія маюць дзіця з інваліднасцю, прадстаўляецца магчымасць узяць адзін дадатковы выхадны ў тыдзень, які аплачваецца за кошт сродкаў наймальніка. Тут ёсць некаторыя ўмовы па выкананні адпрацоўкі рабочага часу.

Акрамя таго, з 2020 года ўстаноўлены бацькаўскі водпуск пры нараджэнні дзіцяці, калі тата ў першыя 6 месяцаў пасля нараджэння дзіцяці мае магчымасць узяць кароткачасовы водпуск да двух тыдняў і разам з маці даглядаць дзіця. Аплата такога водпуску сёння не прадугледжана ў заканадаўстве, але яна можа быць прапісана ў калектыўным дагаворы або іншым лакальным акце наймальніка», — падкрэсліў супрацоўнік Мінпрацы.

Спецыялісты дадалі, што да разгляду ў другім чытанні рыхтуецца праект закона з прапановамі ў Працоўны кодэкс, якія пашыраць магчымасці для сумяшчэння работы і бацькоўства. У прыватнасці, дакументам прадугледжваюцца ўмовы па развіцці больш гібкіх форм занятасці. У выпадку прыняцця законапраекта шматдзетныя бацькі змогуць выбраць з двух варыянтаў: або выкарыстоўваць дадатковы выхадны ў тыдзень на поўны дзень, або забяспечыць сабе скарочаны на адну гадзіну рабочы дзень з захаваннем заработнай платы.

Прадугледжаны таксама і пенсіённыя гарантыі для бацькоў з дзецьмі. «У агульны стаж для прызначэння пенсіі ўключаюцца перыяды догляду дзяцей ва ўзросце да трох гадоў агульнай працягласцю не больш за 12 гадоў, — нагадаў Валерый Кавалькоў. — Мацярам, якія нарадзілі чатырох дзяцей і выхавалі іх да 8-гадовага ўзросту, зніжаны страхавы стаж для прызначэння пенсіі па ўзросце на агульных падставах да 10 гадоў. Па агульных правілах у гэтым годзе стаж з выплатай страхавых узносаў павінен складаць не менш за 19 гадоў. Яго працягласць у нас павялічваецца і будзе складаць 20 гадоў да 2025 года. Мацярам, якія нарадзілі пяць і больш дзяцей, прызначаюцца датэрміновыя пенсіі — на пяць гадоў раней агульна ўстаноўленага пенсіённага ўзросту пры паніжаных патрабаваннях да стажу работы з выплатай страхавых узносаў: патрабуецца ўсяго толькі пяць гадоў выплаты. Мацярам, якія нарадзілі і выхавалі 9 і больш дзяцей і ўзнагароджаны адной з дзяржаўных узнагарод СССР за мацярынства ці ордэнам Маці, прадстаўлена права на пенсію за асобыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь. Сёння такую пенсію ў нас атрымлівае 471 мама».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

### ЛЕТА НЕ ЗА ГАРАМІ: ЧАС ПАДУМАЦЬ ПРА АЗДАРАЎЛЕННЕ

Самай актуальнай мерай падтрымкі шматдзетных сем'яў у летні перыяд з'яўляецца дапамога ў аздараўленні дзяцей. «Хлопчыкі і дзяўчынкі могуць летам двойчы аздаравіцца ў загарадным аздараўленчым лагеры з кругласутачным знаходжаннем, а таксама адпачыць адзін раз у 9-дзённым профільным кругласутачным лагеры і адзін раз — у лагеры з дзённым знаходжаннем з выкарыстаннем бюджэтнага фінансавання, — праінфармавала **галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення выхаваўчай і маладзёжнай палітыкі ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена ВАЙЦЯХОВІЧ.** — Каб скарыстацца гэтай мерай падтрымкі і запланаваць аздараўленне сваіх дзяцей, бацькам неабходна звярнуцца да спецыяліста па аздараўленні ва ўпраўленне па адукацыі па месцы жыхарства ці ва ўстанову адукацыі па месцы навучання дзіцяці.

### У САМАЙ ВЯЛІКАЙ СЯМ'І — 13 ДЗЕТАК

У Беларусі створаны ўсе ўмовы для таго, каб у сем'ях нараджаліся і выхоўваліся дзеці. Гэта і бясплатная адукацыя, і медыцына, і шырокая сетка творчых і спартыўных устаноў, а таксама матэрыяльная і сацыяльная падтрымка. Усе гэтыя меры даюць свае станоўчыя вынікі. Паводле даных перапісу насельніцтва 2019 года, у краіне павялічылася колькасць двухдзетных сем'яў: сёння кожная трэцяя сям'я ў краіне мае дваіх дзетак. Пры гэтым прадаўжае павялічвацца колькасць шматдзетных сем'яў. Іх у краіне ўжо больш за 122 тыс., там выхоўваюцца амаль 400 тыс. дзяцей, гэта кожнае пятае дзіця ў Беларусі. У 80 працэнтах шматдзетных сем'яў гадуецца трое дзяцей, у 14,3 працэнта — чацвёра, крыху больш за 5 працэнтаў — сем'і з пяццю і больш дзецьмі. Самая вялікая колькасць юных беларусаў на сёння — 13 — у бацькоў з Брэсцкага рэгіёна.

# НАСТАЎНІЦА З ХАРАКТАРАМ

## Як гараджанка знайшла сябе ў сельскім жыцці

**Вольга ГАРШКОВА — бабруйчанка, пры жаданні магла б лёгка ўладкавацца ў горадзе. І разумніца, і актывістка, і працаўніца. Але, калі трапіла ў Кіраўск, уразілася біяграфіяй чалавека з вялікай літары — Кірылы Пракопавіча Арлоўскага. Знакаміты контрразведчык, легендарны старшыня калгаса «Світанак» Кіраўскага раёна — яго асабістае жыццё лягло ў аснову сцэнарыя вядомага фільма «Старшыня». На яго прыкладзе Вольга Гаршкова зразумела, што сапраўднае месца для творчасці і рэалізацыі сваіх магчымасцяў — менавіта невялічкі населены пункт, дзе ўсё на паверхні, дзе да твайго слова прыслухоўваюцца, дзе сапраўдная прастора для ініцыятывы. Толькі было б жаданне дзейнічаць. А ў амбіцыйнай бабруйчанкі яно было заўсёды.**





### ЯК АРЛОЎСКІ «ПРАПІСАЎСЯ» Ў ШКОЛЬНЫМ МУЗЕІ

Пераезд з Бабруйска ў Кіраўскі раён быў выкліканы абставінамі. Вольга тады яшчэ вучылася ў інстытуце, калі яе бацьку запрасілі ўзначаліць у знакамітай гаспадарцы аддзел забеспячэння. Маці, якая працавала медсястрой, пераехала разам з ім. А калі ён у 53 гады нечакана памёр, не стала вяртацца ў Бабруйск. Хутка да яе пераехала і дачка.

Гэта цяпер Вольга Гаршкова — начальнік структурнага падраздзялення ААТ «Світанак» «Санаторый імя К. П. Арлоўскага», а пачыналася ўсё з пасады завуча ў мышкавіцкай школе.

— Па прафесіі я педагог, — расказвае Вольга Усеваладаўна. — Скончыла магілёўскі на той час інстытут імя А. Куляшова па спецыяльнасці «фізік-матэматык». Амаль 24 гады працавала кіраўніком мышкавіцкай сярэдняй школы. Благаславіў мяне на гэтую работу старшыня калгаса Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў, паслядоўнік Кірыла Пракопавіча Арлоўскага. Ён быў не менш харызматычным чалавекам і заслужаным работнікам. Ад бацькі я атрымала ў спадчыну ўпартасць да працы, а Старавойтаў навучыў мяне быць кіраўніком.

Аграгарадок Мышкавічы — цэнтральная сядзіба гаспадаркі, і нават школа аграгарадка ўмоўна лічыцца калгаснай, бо знаходзіцца на яе тэрыторыі. Калі выпускніца магілёўскага педінстытута Вольга Гаршкова прыехала працаваць у Мышкавічы, яшчэ жывая была жонка Кірыла Арлоўскага — Тацяна Васільеўна. Яна расказвала пра свайго мужа шмат цікавага. Па просьбе маладой настаўніцы, домработніца Арлоўскіх пасля смерці Тацяны Васільеўны перадала для школьнага музея шмат асабістых рэчаў Кірыла Пракопавіча. Сярод іх — кнігі, адзенне, узнагароды, лісты, нават — радыёла. Гэты музей і цяпер існуе ў школе.

### У СЕЛЬСКУЮ ШКОЛУ ПА ВОПЫТ

Вольга Гаршкова заўсёды любіла матэматыку, расказвае, што гэтым яе заразілі школьныя настаўнікі Святлана і Уладзімір Мароны, якія выкладалі ў бабруйскай школе № 25.

— Калі я стала дырэктарам мышкавіцкай школы, вазіла настаўніка матэматыкі туды на адкрытыя ўрокі, — усміхаецца суразмоўніца. — Святлана Марон пачынала ўрок матэматыкі не з хатняга задання, а з нейкіх вельмі блізкіх для школьнікаў падзей. Магла спытацца, якім лікам скончыўся хакейны матч ці які фільм глядзелі і чым ён спадабаўся. Урокі пралталі як адно імгненне. Яе муж фізік быў не менш арыгінальны. Мог знянацку спытацца не пра нейкія там формулы, а чаму, напрыклад, неба блакітнае. Калі не ведалі адказу, патрабаваў даведацца і на наступным уроку зноў пытаўся. Такім чынам развіваў у дзяцей дапытлівасць.

На ўроках Вольгі Гаршковай таксама сумна не было. У мышкавіцкай школе яна вяла прафільныя групы, гэта была навацыя для сельскай мясцовасці. Старшыня калгаса Васіль Старавойтаў дапамагаў развіваць гэты кірунак.



Першы камп'ютарны клас у раёне таксама з'явіўся менавіта ў Мышкавічах. Грошы на яго выдзеліў старшыня калгаса. І школы Кіраўскага раёна ездзілі ў вёску на ўрокі інфарматыкі.

— Мы шмат у чым былі першыя, — прызнаецца Вольга Усеваладаўна. — Васіль Канстанцінавіч вырашаў бытавыя пытанні, а я цалкам прысвячала сябе вучэбнаму працэсу. У сярэдзіне 90-х мы ўдзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе «Школа будучага — XXI стагоддзе». Напісалі праект, які быў прызнаны адным з найлепшых. За гэта атрымалі магчымасць наведаць ліцэй Спінозы ў Амстэрдаме. Вывучалі там дальтан-тэхналогію, пісалі праграмы, распрацоўвалі ўрокі. У СССР дальтан-план шырока прымяняўся ў 1920—1930-я гады пад назвай брыгадна-лабараторны метад навучання. Такім чынам чалавеку прышчаплялі звычку самастойнай работы.

У 2000-м мышкавіцкая школа ўдзельнічала яшчэ ў адным рэспубліканскім конкурсе, і таксама — удала. Перамога дала магчымасць 15 вучням і настаўнікам сельскай школы з'ездзіць у Амерыку на два месяцы. Настаўнікі пераймалі там вопыт, а вучні вучыліся.

— Я там выкладала рускую мову, — расказвае суразмоўніца. — А яшчэ мы знаёмілі амерыканскіх дзяцей з нашымі традыцыямі, паказвалі ім беларускія касцюмы. Самі знаёміліся з культурай Амерыкі, яе сістэмай адукацыі. Потым амерыканскія дзеці і настаўнікі прыязджалі да нас. Мы іх вазілі ў Мінск на экскурсію, на прагулку ў лес. Яны вельмі здзіўляліся мурашкам, фатаграфавалі іх. У іх прырода не такая натуральная, як у нас.

### МАЁНТАК ФОН ГОЕРАЎ

На пасаду дырэктара санаторыя Вольга Гаршкова трапіла пасля работы ў райвыканкаме, дзе дзевяць гадоў курыравала на правах намесніка старшыні сацыяльную сферу. Пра асаблівасці санаторыя ведала дасканала, асабліва захапляла гісторыя таго месца, дзе ён знаходзіцца. Тут калісьці стаяў маёнтак дваранскага роду фон Гоераў пад назвай Качэрычы. Да нядаўняга часу пра гэты род у Кіраўску мала што ведалі. Але цікаўнай Вользе Гаршковай дапамагла аднавіць яго гісторыю ўнучка Якуба Коласа.

— Мы з ёй пазнаёміліся каля 10 гадоў таму, — усміхаецца суразмоўніца. — Я ўжо ўзначальвала санаторый, калі Вера Міцкевіч прыехала сюды на адпачынак. Я падзялілася з ёй гісторыяй нашых мясцін, расказала, што мы знаходзімся на тэрыторыі былога маёнтка. Яна зацікавілася і дапамагла сабраць інфармацыю пра сямейства фон Гоераў. Шукала звесткі ў архівах Расіі і Прыбалтыкі і знайшла шмат цікавага. Высветлілася, што прадстаўніцамі гэтага роду былі знакамітая расійская пісьменніца Тэфі і славутая руская карунячніца, заснавальніца практычнай школы карунячніц, Соф'я Давыдава, народжаная фон Гоер. Сярод нашчадкаў Міра Лохвіцкая, якую яшчэ называюць царыцай рускага верша. Яна першая атрымала прэстыжную Пушкінскую прэмію. Прамы нашчадак роду — Леў Віктаравіч фон Гоер, міністр фінансаў урада адмірала А. Калчака. Маёнтак Качэрычы згадваецца ў «Гербоўніку беларускай шляхты» як маёмасць рагачоўскага павятовага маршалка Мікалая Ланеўскага-Ваўка. Ланеўскія-Ваўкі парадніліся з дваранскім родам фон Гоераў, якім і належала памесце ў апошняй чвэрці XIX стагоддзя. Вера Міцкевіч сабрала радавод аж да 10 калена. Летась выйшла яе кніга «Сядзіба Качэрычы, шляхамі Ланеўскіх-Ваўкоў, фон Гоераў і іх нашчадкаў». Яна ёсць у бібліятэцы нашага санаторыя. Як і творы прадстаўніцы гэтага роду Тэфі.

Дарэчы, унучка Вольгі Гаршковай — Лізавета — таксама прасякнулася цікавасцю да гісторыі роду фон Гоераў. Яна напісала сваё даследаванне, за якое атрымала грант Прэзідэнта.

### ЖАНЧЫНА ПАВІННА СЯБЕ ЛЮБІЦЬ

Вольга Гаршкова — жанчына з густам. У яе заўсёды прычоска, манікюр, яркае адзенне. Яна і да сваіх падначаленых па санаторыі ставіцца з патрабаваннем выглядаць на ўсе 100. Адпачывальнікі павінны бачыць, што яны тут вельмі жаданыя. Што ім рады, іх чакаюць, стараюцца выглядаць для іх прыгожа.

— Сёння вельмі напружаны час, — кажа кіраўніца. — Да нас прыязджаюць тыя, хто перахварэў на ковід, з аслабленым імунітэтам, псіхікай. Таму і працэдуры мы прапануем з улікам гэтых асаблівасцяў. На карысць ідуць аквааэробіка, фітнес, басейн. У нас ёсць возера, пляж. Практыкуем гразевыя абгортванні, водныя працэдуры. Нават свідравіна з мінеральнай вадой ёсць. Адпачывальнікі могуць прымаць мінеральныя ванны. У нас працуюць два касметолагі, ёсць стаматолаг, цырульнік. Работнікі санаторыя, якія адпрацавалі ў нас не меней чым пяць гадоў, таксама маюць магчымасць раз на год атрымаць бясплатна комплекс працэдур. Я і сама гэтым карыстаюся. Такі падарунак робіць наш калгас. Усім сваім знаёмым раю як мінімум два разы ў год адпачыць. Гэта адна з умоў выглядаць прыгожа і выпрацаваць імунітэт супраць хвароб. Гэткая прышчэпка ад старэння.

Асаблівасць санаторыя ў тым, што яго заснавальнік Кірыл Арлоўскі будаваў міні-здраўніцу для сваіх работнікаў. Ён таксама быў перакананы, што чалавек, які працуе напружана, павінен мець магчымасць адпачыць з карысцю. Работнікі гаспадаркі і цяпер тут адны з пастаянных кліентаў. Хапае і гасцей з іншых краін. Вельмі частыя кліенты санаторыя — расіяне. Сяброўства гэта, дарэчы, таксама з гісторыяй.

— Пасля развалу Саюза Васіль Старавойтаў і старшыня белгарадскага калгаса імя Фрунзе Белгарадскага раёна ў Расіі — абодва дэпутаты Вярхоўнага Савета Савецкага Саюза — аб'ядналіся, — расказвае Вольга Усеваладаўна. — Ніхто тады не ведаў, як працаваць, што рабіць, а яны выпрацавалі сваю стратэгію і яднанне. Сябравалі, мелі зносіны. Калгас Фрунзэ быў прыкладна такі, як «Світанак». З гэтага завязалася моцнае сяброўства з Белгарадам. Разам адпачывалі, закладвалі сады, алею. У нас тут растуць белгарадскія клёны і нават абрыкосы. У 2013 годзе ў Кіраўскім ДК стварылі Пакой сяброўства Кіраўскага і Белгарадскага раёнаў. На Дзень адзінства Беларусі і Расіі там праходзяць тэматычныя ўрокі.

### З УСІМІ І ДЛЯ ЎСІХ

Вольга Гаршкова мае шмат узнагарод за сваю прафесійную і грамадскую дзейнасць. Яна настаўнік вышэйшай катэгорыі, выдатнік асветы Рэспублікі Беларусь. Яе дэвіз па жыцці — «Калі не я, то хто? Не для сябе і не для іншых, а з усімі і для ўсіх». Яна ўзначальвае не толькі санаторый, але яшчэ і Кіраўскую арганізацыю Беларускага фонду міру. Сярод узнагарод — адна з самых дарагіх сэрцу — медаль ад Фонду міру «Ганаровы міратворац». Наша гераіня неаднаразова адзначалася за добрасумленную працу на пасадзе кіраўніка санаторыя. Сёння турысцкая сфера — адна з найбольш складаных, і трэба мець моцны характар, каб трымаць бізнес на плаву і знаходзіць новыя нішы на рынку паслуг.

— Вельмі важнай і знакавай стала для мяне сёлета Падзяка ад кіраўніка нашай гаспадаркі ААТ «Світанак» імя К. Арлоўскага» Аляксандра Багеля, — прызнаецца Вольга Гаршкова. — Да пандэміі было лёгка працаваць, але апошнія два гады для нас былі сапраўды цяжкімі. Тых паказчыкаў, якія былі раней, пакуль няма. Але кіраўнік гаспадаркі ацаніў нашы старанні. Я разумею, што гэта заахвочвальная падзяка, але менавіта яна і самая дарагая. Нас пахвалілі, нягледзячы на тыя складанасці, якія мы перажываем. І гэта вельмі добры стымул.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**Кіраўскі раён.**
**Фота аўтара і з архіва гераіні.**

Па палічках

# СПАЖЫВАННЕ АГУЛЬНАЕ, АПЛАТА ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ

## Асаблівасці выкарыстання электралічыльнікаў у кватэры і на дачы

**Арганізацыя правільнага ўліку электраэнергіі і яе безліковае выкарыстанне. Акалічнасці эксплуатацыі прылад уліку ўжытай электрычнасці і іх вынасу з жылля. Пакрыццё затрат на аплату страт электрычнасці ў сетках садовых таварыстваў (СТ) і заключэнне прамых дагавораў паміж членамі СТ і энергазабяспечвальнымі арганізацыямі. Пра найбольш распаўсюджаныя сітуацыі, звязаныя з работай прылад уліку электраэнергіі, і тое, што трэба рабіць, расказалі ва ўпраўленні збыту электраэнергіі «Белэнерга».**



### ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ПРЫЛАДА ПАШКОДЖАНА

Энергетыкі ў сваёй рабоце кантактуюць з кожным з абанентаў энергазабяспечвальных арганізацый — грамадзянамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі ці юрыдычнымі асобамі — і адказваюць на ўсе пытанні, падкрэсліў **Андрэй ШЭРШАНЬ, намеснік генеральнага дырэктара «Белэнерга»:**

— Часта людзі самі высвятляюць, што іх прылада ўліку электраэнергіі няспраўная. У гэтым выпадку спажывец пераводзіцца ў разрад безліковых і разлік за ўжытую энергію вядзецца не па паказчыках прылады, а па метадыцы, вызначанай Мінэнерга. Згодна з Правіламі электразабеспячэння, якія былі зацверджаны пастановай Саўміна № 1394, калі грамадзянін знайшоў пашкоджанне электралічыльніка і (або) пломб, што ўстаноўлены на ім ці на камутацыйных апаратах, ён абавязаны апавясціць пра гэта энергазабяспечвальную арганізацыю. Згодна з Правіламі і артыкулам 97 Жыллёвага кодэкса, рамонтна-метралагічнае абслугоўванне, аднаўленне, праверка працаздольнасці, планавая замена прылад — зона адказнасці грамадзяніна, ІП ці юрыдычнай асобы, якія з'яўляюцца ўласнікамі лічыльніка.

У шматкватэрных жылых дамах, што абсталяваны АСКУЭ (аўтаматызаванай сістэмай камерцыйнага ўліку электраэнергіі), цэласнасць, рамонтна-метралагічнае абслугоўванне, аднаўленне, праверка працаздольнасці, планавая замена прылады (у тым ліку АСКУЭ, лічыльнікі грамадзян, якія карыстаюцца электраэнергіяй; прылады, якія ўлічваюць расход электраэнергіі на агульна-дамавыя патрэбы, і іншыя прылады), забяспечваюцца арганізацыямі, ва ўласнасці якіх знаходзяцца пералічаныя сродкі, або энергазабяспечвальнай арганізацыяй на дагаворнай аснове. Затраты на гэта аплачваюцца грамадзянамі. Усе прылады, дарэчы, можна перадаць на баланс энергазабяспечвальнай арганізацыі — тады яна будзе несці ўсе затраты па абслугоўванні. Калі дом — гэта таварыства ўласнікаў, то рашэнне павінна прымацца ўсімі яго членамі.

### НАВОШТА ЛІЧЫЛЬНІКУ ШАФА ПА-ЗА МЕЖАМІ ДОМА

Дачнікі часта цікавяцца, чым рэгламентуюцца патрабаванні па прымяненні вынаснога ўліку электраэнергіі, агучыў спецыяліст:

— Патрабаванні па ўстаноўцы сродкаў разліковага ўліку электраэнергіі па-за межамі аднакватэрных дамоў за межамі або на мяжы ўчастка ў асобнай жалезнай шафе вызначаны пэўнымі нарматыўнымі актамі. Вынасны ўлік — адно з мерапрыемстваў, якое дазваляе не дапусціць безліковага спажывання электраэнергіі. Акрамя таго, гэта забяспечвае цішыню і спакой уладальнікам лічыльніка, то-бок спецыяліст правярае работу прылады, не турбуючы спажыўца.

Гэта датычыцца ўласных сядзіб і рашэння іх гаспадароў. А вось ці можа кіраўніцтва СТ патрабаваць ад сваіх членаў вынесці прылады ўліку электраэнергіі за межы садовага доміка, цікавяцца гаспадары дач.

— Узаемаадносіны паміж членамі СТ вызначаюцца Указам Прэзідэнта № 50, тыпавымі правіламі і статутам, згодна з якімі член ТС абавязаны выконваць рашэнні, прынятыя агульным сходам, а аспрэчваць іх можна толькі ў судзе. Сэнсу звяртацца ў энергазабяспечвальную арганізацыю па гэтым пытанні няма, — падкрэсліў «Белэнерга».

У сваю чаргу кіраўніцтва садовага таварыства можа адключыць ваду і святло тым, хто не падпарадкоўваецца прынятым рашэнням.



### ЧЫМ ЭЛЕКТРОННЫЯ ЛЕПШ ЗА ІНДУКЦЫЙНЫЯ

Дзяржаўная паверка электралічыльнікаў адбываецца ў залежнасці ад іх тыпу. Для большасці электронных прылад уліку, якія ўключаны ў дзяржаўны рэестр сродкаў вымярэння (ён змешчаны на сайце Беларускага дзяржаўнага інстытута метралогіі), міжпаверачны інтэрвал складае восем гадоў. Для індукцыйных аднафазных прылад — восем гадоў, для трохфазных — чатыры гады, расказаў намеснік гендырэктара:

— У Беларусі працягваецца работа па замене індукцыйных лічыльнікаў электроннымі. З 2015 года, згодна з праграмай мадэрнізацыі сродкаў разліковага ўліку, у краіне павінна быць заменена 3,5 млн лічыльнікаў. У шматкватэрных дамах у грамадзян ужо больш за тры мільёны індукцыйных прылад заменены электрычнымі, якія ўсе знаходзяцца на балансе энергазабяспечвальных арганізацый.

Электронны лічыльнік больш абаронены ад знешняга ўмяшальніцтва ў яго работу і практычна цалкам выключае магчымасць крадзяжу электрычнасці. Да таго ж ён больш дакладна лічыць, колькі электраэнергіі ўжыў чалавек. Новыя прылады маюць клас дакладнасці 1, у старых індукцыйных ён быў 2,5. Электронныя лічыльнікі дазваляюць дыстанцыйна перадаваць паказчыкі ў разліковыя праграмы энергазабяспечвальнай арганізацыі ці ў АРІП для аплаты, складаць баланс электраэнергіі і выконваць шмат іншых функцый.

### ЧАМУ ДАЧНІКІ ПЛАЦЯЦЬ ЗА АГУЛЬНАЕ ЎЖЫВАННЕ І ТРАНСПАРЦІРОЎКУ ЭНЕРГІІ

Часта гаспадароў садовых дамкоў хвалюе, чаму ім нельга заключыць дагавор на электраабслугоўванне напрамую з арганізацыямі аблэнерга.

— Згодна з пунктам 170 Правіл, садовыя таварыствы і гаражныя дачныя кааператывы разлічваюцца за выкарыстаную электраэнергію на падставе паказчыкаў прылад групавога ўліку энергію, якія ўстаноўлены на мяжы балансавай прыналежнасці электрычнай сеткі з энергазабяспечвальнай арганізацыяй. Дагавор электразабеспячэння заключаецца з садовым таварыствам як з юрыдычнай асобай, а з членамі СТ заключэнне дагавораў законам не прадугледжана, — нагадаў Андрэй Шэршань.

Садовае таварыства як юрыдычная асоба мае адасобленую маёмасць і самастойны баланс, таму аплачвае таксама і тэхналагічны расход на транспарціроўку энергіі ў высакавольтных электраўстаноўках, якія знаходзяцца на балансе СТ, удакладніў спецыяліст:

— Электразабеспячэнне практычна ўсе садовыя таварыствы атрымліваюць ад паветраных ліній напружаннем 10 кВ, якія знаходзяцца на балансе энергазабяспечвальных арганізацый «Белэнерга». Адбываецца гэта наступным чынам: да паветранай лініі 10 кВ далучаецца адпайка даўжынёй ад некалькіх дзясяткаў да некалькіх соцень метраў, да якой, у сваю чаргу, далучаецца камплектна-паніжальная трансфарматарная падстанцыя напружаннем 0,4—10 кВ. У большасці выпадкаў і адпайка, і падстанцыя знаходзяцца на балансе СТ, а разліковы лічыльнік усталяваны на камплектнай трансфарматарнай падстанцыі (КТП). Прылада ўлічвае сумарную колькасць энергіі, ужытай электрапрыёмнікамі ўсіх садовых дамкоў, а таксама страты электраэнергіі ва ўсіх паветраных лініях 0,4 кВ, па якіх энергія транспарціруецца ад КТП да садовага дамка.

Пры гэтым СТ павінна дадаткова аплаціць страты электраэнергіі ў адпайкі лініі 10 кВ і страты ў сілавым трансфарматары КТП, паколькі гэтыя элементы электрасеткі знаходзяцца на балансе СТ, аднак страты электраэнергіі ў іх разліковым электралічыльнікам не ўлічваюцца. Збытавыя падраздзяленні энергазабяспечвальных арганізацый штомесяц робяць разлік гэтых страт для кожнага садовага таварыства. Неабходнасць аднясення страт у сетках абанента на канкрэтнага спажыўца абумоўлена тым, што ў тарыфах на электраэнергію закладзены толькі нарматыўныя страты (тэхналагічны расход) у сетках, якія знаходзяцца на балансе энергазабяспечвальных арганізацый, засведчыў эксперт.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кіраўнік Цэнтрабанка Ірана назваў адмову ад долара стратэгічнай палітыкай краіны

Стратэгічная палітыка цэнтральнага банка Ірана складаецца ў тым, каб адмовіцца ад долара ЗША ў гандлі з іншымі краінамі і на валютных біржах. Пра гэта заявіў кіраўнік Цэнтрабанка Ірана Махамад Рэза Фарзін на сустрэчы з міністрам гандлю, прамысловасці і заахвочвання інвестыцый Амана Кайсам бен Махамадам Аль Юсэфам, паведаміла агенцтва Irna. «Амерыканцы выкарыстоўваюць долар як палітычны інструмент для ціску на дзяржавы, у той час як іншыя валюты ў свеце становяцца ўсё больш запатрабаванымі, асабліва ў азіяцкім рэгіёне», — адзначыў Фарзін. Кіраўнік ЦБ Ірана заявіў аб гатоўнасці поўнасцю выключыць амерыканскі долар з гандлёва-эканамічных аперацый паміж Іранам і Аманам. Ён паведаміў, што ўжо ёсць адпаведныя магчымасці для выкарыстання нацыянальных валют.

### Сёлета агульная колькасць турыстычных паездак перавысіць 10 мільярдаў

Чакаецца, што колькасць турыстычных паездак па ўсім свеце дасягне 10,78 мільярда, што складае амаль 75 працэнтаў ад узроўню 2019 года. Сёлета даходы ад турызму ва ўсім свеце дасягнуць 5 трыльёнаў долараў — 86,2 працэнта ад узроўню 2019 года. Гэта вынікае з даклада, апублікаванага сумесна цэнтрам па вывучэнні турызму пры Акадэміі грамадскіх навук Кітая і Сусветнай федэрацыяй турыстычных гарадоў, паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа». Адзначаецца, што колькасць турыстычных паездак па ўсім свеце летась склала 9,57 мільярда, а прыбыткі ад турызму дасягнулі 4,6 трыльёна долараў. «Сусветная эканоміка турызму паступова аднаўляецца, і глабальную турыстычную індустрыю чакае больш светлая будучыня, — адзначыла дырэктар цэнтра па вывучэнні турызму Сун Жуй. — Аднак таксама варта разумець, што нявызначанасць у сусветнай эканоміцы па-ранейшаму будзе ўплываць на перспектывы турыстычнай галіны».

### У Італіі ліквідавалі злачынную сетку па перавозцы нелегальных мігрантаў



Італьянская паліцыя арыштавала 29 падазраваных, якія на працягу многіх гадоў займаліся нелегальнай перавозкай мігрантаў у Італію па моры, а пасля па сушы ў Паўночную Еўропу, паведаміла Associated Press. Як заўважыла выданне, расследаванне было ініцыяванае пракуратурай у Калабрыі і доўжылася чатыры гады. Мэнавіта ў гэты рэгіён прыбываюць мігранты з Турцыі і Грэцыі. Людзей перапраўляюць на добра абсталяваных суднах, якія пазбягаюць выяўлення паліцыяй ці вайскоўцамі. Па словах следчых, некаторыя мігранты плацілі да 15 тысяч еўра за чалавека.

## Да 140-годдзя Янкі Маўра

# ЁН ХАЦЕЎ НАПІСАЦЬ РАМАНЫ ПРА СПАРТАКА І КРЫЖАКОЎ

**Гэты пісьменнік, які нарадзіўся 140 гадоў таму, — адзін з самых папулярных за ўсю гісторыю беларускай літаратуры... І самы таямнічы.**
**Ягo кнігі ўзначальваюць чытацкія рэйтынгі, а ці кожны з прыхільнікаў зрэагуе на імя Іван Фёдараў? Аднак, гэта і ёсць сапраўдныя імя і прозвішча легендарнага Янкі Маўра, аўтара «Палескіх рабінзонаў».**
**Не ўсе дасюль ведаюць і пра тое, што Янка Маўр parадніўся з Якубам Коласам — яго дачка выйшла замуж за сына Коласа Міхася... І сёння наша суразмоўца — унучка абодвух класікаў, Марыя Міхайлаўна Міцкевіч.**



Янка Маўр з унукамі Марыяй і Сяргеем.

***— Пісьменнік Змітрок Астапенка запэўніваў, што можа ў думках падарожнічаць па любых далёкіх краінах і падрабязна апісваць убачанае... Пра дакладнасць сваіх «візій» з іншых планет сцвярджаў Язэп Драздовіч. Чытаючы Янку Маўра, лавіла сябе на думцы: ці не было ў яго таксама якойсьці звышнатуральнай здольнасці? Бо ён апісвае экзатычныя краіны, хоць ніколі там не падарожнічаў...***

— Так, Маўр ніколі не бываў за межамі Савецкага Саюза... Але ён працаваў настаўнікам гісторыі і геаграфіі, у яго мелася адна з найлепшых бібліятэк на той час, і Маўр вельмі ўважліва чытаў успаміны падарожнікаў. Яго ўрокі ў школе, як згадваў яго вучань Міронаў, былі незвычайныя. То ўсе ўяўлялі, як прабіваліся праз ільды Антарктыды, то падарожнічалі разам з Міклухам-Маклаем... Па словах Сяргея Грахоўскага, Маўр быў злучаны з усім светам праз мову эсперанта і мог гадзінамі расказваць пра розныя краіны, хоць там ніколі не быў. Можа, меліся і нейкія асаблівыя здольнасці. Калі ён напісаў раман «Амок», то нават супрацоўнікі інданезійскага пасольства не маглі паверыць, што Маўр не быў у Інданезіі, — настолькі дакладна апісана.

***— А сваім дзецям і унукам расказваў экзатычныя гісторыі?***

— Любіў распавядаць пра розныя краіны. У яго была вялікая перапіска з эсперантыстамі, ён жа быў эсперантыстам з вялікім стажам, яшчэ з 1904 года. Калі я маленькая прыходзіла да дзеда, мяне цікавілі, вядома, у першую чаргу маркі. Ён мне казаў: «Калі ты хочаш гэтую марку, трэба ведаць аб гэтай краіне». Расказваў, чым тая краіна адметная, стараўся зацікавіць падарожжамі... Відаць, зацікавіў, бо я ўжо дзе толькі ні была. Маўр яшчэ ў дзяцінстве хацеў праплысці па ўсіх рэках свету, нават маршруты сабе маляваў, але ўсё засталося віртуальным.

***— Відаць, адгукнулася, што нарадзіўся на моры...***

— Так, нарадзіўся ў Лібаве, куды сям'я прыехала ў заробкі. Яму падабалася мора, ён вельмі добра плаваў, нырaў. Можна згадаць гісторыю, як ён выратаваў на моры дзяўчынку, калі яму было ўжо за семдзесят гадоў. Ён жа тады быў амаль сляпы, плыў ратаваць па слыху...

***— Друкавацца Маўр пачаў даволі позна, па сучасных паняццях. Пасля сарака, здаецца...***

— Так, з 1923 года. Таму мы адзначаем у гэтым годзе не толькі яго юбілей, але і 100-годдзе літаратурнай дзейнасці. Цікава, што нават калі кніжкі яго пачалі выдавацца, у Саюзе пісьменнікаў яго ніхто не ведаў. Пятро Рунец апісвае, як Маўра спыталі ў Саюзе: «Ці праўда, што ў вас ёсць выдадзеныя кніжкі?» А ў яго было ўжо шэсць ці сем. Хтосьці ўспамінаў, як тады паступаў ва ўніверсітэт, і на пытанне, хто з беларускіх літаратараў падабаецца, адказаў: «Я люблю чытаць Янку Маўра». А прыёмная камісія пачала рагатаць: «Мы такога пісьменніка не ведаем». Такія выпадкі для Янкі Маўра былі цяжкія. У бібліятэках яму казалі, што яго кніжкі карыстаюцца попытам, а ў дзяржаўнай прэсе пра іх маўчалі, увогуле, на дзіцячую літаратуру мала ўвагі звярталі, і Маўр перажываў. Ён заўсёды лічыў, што пачынаць выхоўваць чытача трэба з дзіцячага ўзросту.

***— Ён жа і артыкулы, і на сённяя актуальныя, пісаў пра дзіцячую літаратуру...***

— «Хоць малыя, але чалавекі», — казаў пра маленькіх чытачоў. Нам ён гаварыў, што не любіць памяншальных форм, сюсюкання. Ён заўсёды размаўляў з намі як з дарослымі. Добра адчуваў дзяцей. Памятаю, як я ў дзяцінстве плакала над хлопчыкам Тубі...

***— Хоць у самога такое цяжкое дзяцінства было... Варта пачытаць яго аўтабіяграфічную кнігу «Шлях з цемры». Нават міласціну нейк з маці хадзіў прасіў...***

— Так, гэта здаралася, калі бацька памёр, маці вярнулася ў вёску, а хата згарэла... У яго дзяцінстве было шмат страшных выпадкаў. Аднойчы ў вёсцы яго і яшчэ адну дзяўчынку пакусаў шалёны сабака. Быў такі боль... А маці якраз мыла бялізну, развяла шчолак, і мой дзед сунуў туды ўкушаную руку, да мокрай бялізны. Дзяўчынка памерла. А майго дзеда зачынілі ў хаце суседзі і не выпускалі, баяліся, што ён таксама звар'яцее і пампэ... Але ён выжыў. Казалі, што яго выратаваў той шчолак. У маленькім узросце воспай перахварэў, думалі таксама, што пампэ, на ўсё жыццё на твары воспіны засталіся.

***— Цікавая ж і гісторыя з яго першым шлюбам — калі ён ажаніўся з жанчынай, да чыіх дзяцей быў запрошаны ў якасці хатняга настаўніка.***

— Янка Маўр разам з Якубам Коласам былі на нелегальным настаўніцкім з'ездзе. Потым усім, хто там удзельнічаў, забаранілі працаваць у школах. Вось знаёмы святар і параіў, што ёсць сям'я ў Турцы, дзе шмат дзяцей, ім трэба настаўнік. Для Маўра гэта было выйсце. Ён вельмі палюбіў тых дзяцей. А потым нечакана памёр муж гаспадыні. Тады пачаліся чуткі, што вось, малады чалавек жыве ў доме з удавой... Ці яму шукаць іншае месца, ці пашлюбавацца. Вырашыў, што трэба жаніцца, хоць жанчына была старэйшай на некалькі гадоў. А калі пераехалі ў Мінск, Маўр уладкаваўся ў Гандлёвую школу, таму што яна не падпарадкавалася міністэрству адукацыі і забароны на працу не было. Нарадзіліся яшчэ дзеці... Жонка захварэла і памерла. Узялі дзяўчыну, якая даглядала дзяцей, да яе прыходзіла сястра Стэфаніда. Вось тая сястра і стала другой жонкай Янкі Маўра, узяла гэтых малых дзяцей і выхавала так, што ніколі не заўважалі, што гэта не іх родная маці. Калі былі нейкія сваркі, яна станавілася заўсёды на бок нярoдных дзяцей. Мая маці, яе родная дачка, вельмі перажывала. А бабуля мая ёй аднойчы патлумачыла: «Я не магу ўчыняць па-іншаму, бо яны мне не родныя, а ты мяне зразумееш».

***— Янка Маўр і Якуб Колас сябравалі з юнацтва?***

— Так. Калі Маўр працаваў настаўнікам у вёсцы Бытчы, ездзіў на ровары па суседніх вёсках, заязджаў і ў тую, дзе працаваў Колас. Маўр ведаў, што ёсць такі Міцкевіч, які піша вершы, але яны не сустракаліся. А вось на настаўніцкім з'ездзе пазнаёміліся. Пра іх сустрэчу Колас цікава напісаў у рамане «На ростанях», маляў, убачыў чалавека з незвычайнымі здольнасцямі, які яшчэ і на скрыпцы добра грае. Маўр там выведзены пад імем Івана Тадорыка. Яны перапісваліся ў час вайны — абодва былі адарваны ад роднай зямлі. Колас быў у Ташкенце, Маўр — у Алма-Аце. І калі чытаеш гэтыя лісты, у іх стольні цеплыні... «Мой дарагой Янка», «мой дружок»... Калі Маўр быў у цяжкім стане, а маю маму выганялі са школы, бо трэба было грошы за навучанне заплаціць, Маўр звярнуўся да Коласа. Потым смяяліся ў сям'і — не ведаў Колас, што заплаціў за будучую нявестку.

***— А як Маўр пісаў? Зачыняўся ў кабінеце і казаў: «Дзеці, ціха»?***

— Ён любіў пісаць па начах. Садзіўся за стол, калі нікога не было, напрыклад, калі дзеці ў школе. Мама ўспамінае, што, калі было холадна, ён абуваў валёнкі, апранаў футра, садзіўся за стол. А мая маленькая мама падлазіла пад гэтае футра, прыгравалася, там і засынала.

***— Цікава ўяўляць, як аўтар аповесці пра спякотную Інданезію піша яе, седзячы ў футры і валёнках...***

— Ён і публіцыстыкі шмат пісаў, на палітычныя тэмы. Нават у газеце «Літаратура і мастацтва» хацелі зрабіць палітычную рубрыку, якую вёў бы Янка Маўр. Ён жа ведаў замежныя навіны з перапіскі з эсперантыстамі, і радыё вельмі любіў слухаць, на мове эсперанта тады было шмат перадач.

***— Уражанне, што ён неяк асобна ад беларускіх літаратарскіх тусовак... Можа, гэта яго і выратавала, калі пачаліся рэпрэсіі?***

— У 1937-м шмат яго сяброў-эсперантыстаў выслалі. І яго выклікалі... Ён папярэдзіў сям'ю, што, можа, ужо і не вернецца, аддаў свой гадзіннік старэйшаму сыну Фёдару. Але яму папаўся следчы, які чытаў яго кнігі. І калі даведаўся, што перад ім Янка Маўр, сказаў: «Ідзіце, не хвалюйцеся, вас больш чапаць не будуць».

Маўр перажываў, што яго творы доўга не перакладаліся. У адным з лістоў піша, што атрымаў два экзэмпляры «Палескіх рабінзонаў» на кітайскай мове, а на рускай усё ніяк не хочуць выдаваць. «ТВТ» выдалі ў перакладзе на рускую мову толькі праз дваццаць гадоў. Хоць самі дзеці перакладалі, пісалі яму лісты... Быў рух «тэвэтэўцаў» па ўсім Савецкім Саюзе, у тым ліку ў Брэсце, але там гэта заўважыла камсамольскае начальства, сказалі — не павінны такія арганізацыі быць, і ўсё прыпынілі.

***— Мне ў свой час вельмі спадабаўся феміністычны пасыл гэтай аповесці: дзяўчынкі могуць прас парамантаваць, прыпаяць штосьці... А сам Маўр быў гаспадарлівы?***

— Так. Ён жа скончыў рамесніцкае вучылішча, шмат што мог зрабіць сваімі рукамі. У яго ёсць п'еса «Балбатун», яе ўжо прынялі да пастаноўкі, але быў 1941-ы, пачалася вайна. У той п'есе — пра яму, паўз якую ўсе хадзілі і ўзнімалі пытанне, як бы яе засыпаць і каму, а потым прыйшоў чалавек, які нікога не слухаў, а ўзяў і засыпаў. Маўр быў менавіта такі.

***— Ці шмат засталося таго, што пры жыцці не друкавалася ці няскончанае?***

— Так, ён шмат пісаў у стол. У архівах застаўся нават незавершаны раман «Жанчына-маці», пра дзяўчынку, якая выратавала з гета дзіця сваёй сяброўкі і гадавала яе свайго сына. У часопісе «Полымя» частка таго рукапісу апублікавана. Тэма вайны для Маўра ўвогуле была важнай. Ён на сабе адчуў яе жахі, калі пад бамбёжкамі адпраўляліся ў эвакуацыю. Таму ўзяўся рэдагаваць і кнігу «Ніколі не забудзем», з успамінамі дзяцей пра вайну. Калі Маўр жыў у Алма-Аце, яму даваліся шмат выступаць, у тым ліку перад вайскоўцамі. Раманы ім не пачытаеш... І Маўр пачаў пісаць байкі. Так што засталіся і неапублікаваныя байкі на вайсковую тэматыку. Цяпер я перадала ў часопіс «Полымя» апавяданне «Першая ластаўка» — пра каханне паэта і тынкоўшчыцы — Маўр, відаць, лічыў яго недасканалым і саромеўся публікаваць. Але там цікавыя дыялогі — Маўр жа быў майстрам дыялогаў, умеў паказаць адносіны паміж людзьмі. У адным з лістоў Янка Маўр піша Коласу з Алма-Аты, што скончыў п'есу «Лицо зверя» і паслаў яе ў Маскву Гарбунову. Больш пра гэтую п'есу мы нічога не ведаем. Наш тэатр юнага гледача адкрываецца п'есай Маўра «На штурм». Маўр напісаў яе вельмі хутка, казалі, прэм'ера не вельмі атрымалася. Але тэксту таксама нідзе няма. Так што, думаю, у нейкіх архівах яшчэ знойдуцца творы Маўра. У яго былі вялікія планы... Хацеў напісаць раман пра Спартака. Праз эсперантыстаў збіраў матэрыялы, складаў карты паходаў Спартака. Казаў, што Джаваньёлі шмат перабольшыў. Адразу пасля вайны хацеў напісаць пра крыжацкія паходы на Расію і Беларусь, у часопісе «Беларусь» за 1945-1946 гады нават былі надрукаваныя звесткі, якія ён сабраў, — канва будучага твора. На жаль, засталася толькі задумка.

***— Што цікавага рыхтуецца да юбілею?***

— Адкрылася выстаўка ў Віцебску, падрыхтаваная з фондаў музея Якуба Коласа і з нашых сямейных архіваў. Будзе выстаўка ў музеі гісторыі беларускай літаратуры, там жа плануецца круглы стол. У Нацыянальнай бібліятэцы таксама выстаўка. З'явяцца артыкулы ў часопісе «Роднае слова» — я напісала пра Маўра і эсперанта, мая дачка Васіліна Міцкевіч — пра дарчыя надпісы Янкі Маўра. Я падрыхтавала лекцыю пра Маўра, з віктарынай, думаю, дзецям, з якімі сустрэнуся ў школах, бібліятэках, будзе цікава. Праўду такую лекцыю ў музеі Якуба Коласа. Я з'яўляюся ўкладальнікам дзвюх кніг, прысвечаных Янку Маўру: «Янка Маўр» («Беларускі кнігазбор», 2016) і «Янка Маўр. Наш вечны рабінзон» («Мастацкая літаратура», 2018). Мая мама Наталля Іванаўна пакінула вельмі цікавыя ўспаміны пра жыццё свайго бацькі Янкі Маўра і свайго свёкра — Якуба Коласа — у кніжцы «Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа», якая выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда» ў 2016 годзе.

***— Хачу удакладніць наконт даты нараджэння Маўра: у энцыклапедыях значыцца 10 мая, у некаторых крыніцах — 11-га.***

— Сам Янка Маўр лічыў сваім днём нараджэння 11 мая. Ён і ў аўтабіяграфіі так пісаў. Таму мы так і будзем адзначаць. Хоць некаторыя навукоўцы кажуць, што, пераводзячы на новы каляндар, мусіць быць 10-га.

***— Не магу не спытаць пра сеансы спірытызму, якія праводзіліся ў доме Маўра, з удзелам сям'і Коласа... Вы неяк сказалі, што нават захаваліся запісы...***

— Не, запісы Маўр спаліў, калі пачаліся рэпрэсіі. А былі нейкія нататкі, больш у гумарыстычным стылі.

***— Іншымі словамі, ставіўся з дозай скепсісу?***

— Ну так. Казаў — усё залежыць ад таго, хто ўдзельнічае. Пры Яўгеніі Пфлямбаўм, напрыклад, талерка круцілася вельмі хутка, ледзь паспявалі запісваць літары. Сама я толькі па расповедах чула пра тыя сеансы. Нават нейкі верш прадыктаваў выклікaны дух. Палічылі, што падобна да паэзіі Ігара Севяраніна, звярнуліся ў Саюз пісьменнікаў па кансультацыю... Там сказалі — так, падобны. На спірытызм існавала ж мода, а Маўр быў цікаўны да ўсяго незвычайнага.

***— А як у апошнія гады, калі страціў зрок, пісаў, дыктаваў?***

— І пісаў, і дыктаваў. Узялі дзяўчыну, якая запісвала. Канешне, цяжка было, але Маўр усё адно хадзіў на сходы ў Саюз пісьменнікаў, стараўся не адрываецца ад жыцця. Паўсюль хадзіў з усмешкай, не паказваў, як яму цяжка. Ён любіў дзяцей і нас, унукаў. Пакінуў цікавыя дарчыя надпісы на кнігах і фотаздымках, якія мы беражліва захоўваем.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**
**Фота з сямейнага архіва.**

**Наталля ТАМЭЛА:**

# «ТРЭБА ЧАСЦЕЙ ПРЫСЛУХОЎВАЦЦА ДА СЯБЕ»



**З першага імгнення спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, салістка Нацыянальнага канцэртнага аркестра імя М. Я. Фінберга Наталля Тамэла адорвае мяне сонечнай усмешкай. Жыццярадаснасць у яе асобе яднаецца з пунктуальнасцю і патрабавальнасцю, што ў суме стварае прафесіянала, якога ведаюць па беларускай эстрадзе гадамі. Яна заўсёды імкнецца дзейнічаць, шукаць свае адказы на пытанні і жыць у гармоніі, якую даюць творчасць і блізкія людзі побач. З нагоды юбілею распыталі ў Наталлі Уладзіміраўны, як скласці ўласны рэцэпт шчасця, чаму яна вучыцца ў калег і што прымае за арыенціры.**

***— Наталля, для вас новы год жыцця пачынаецца па календары ці ў дзень нараджэння?***

— Ведаеце, сёлета я злавіла сябе на думцы, што хачу пачаць адлік новага жыцця з Вялікадня. А так штогод рабіла тое, як і многія, з 1 студзеня, калі хочацца пажадаць сабе чагосьці новага, каб усе былі здаровыя, і будаваць новыя планы, праекты.

***— А дзень нараджэння як святкуеце?***

— У дзяцінстве мы ўсе вельмі чакаем гэтае свята. А ў дарослым узросце, калі ўжо сам сабе дні нараджэння рыхтуеш, то часам стамляешся. Таму ў гэтым годзе я вырашыла адпачываць і даручыла ўсю падрыхтоўку свята людзям, якія ўмеюць рабіць гэта прафесійна. Каб самой не гатаваць, не прыбіраць потым і не бегаць паміж гасцей, замовіла кейтэрынг. У сам дзень нараджэння разам з маімі найлепшымі сябрамі і роднымі людзьмі мы збярэмся за горадам, і ў мяне будзе цудоўнае свята. Думаю, я гэтага вартая. Спадзяюся, што і надвор'е паспрые!

***— Выпадала вам адзначаць дзень нараджэння на сцэне?***

— Не, такога ў мяне не здаралася. У сакавіку толькі быў канцэрт невялікі «Бенефіс», прысвечаны юбілею работы ў аркестры. А іншую вялікую канцэртную праграму я планую зрабіць у наступным годзе. І для мяне не маюць значэння лічбы, даты, бо галоўнае, каб выспеў музычны матэрыял, канцэпцыя — і тады наперад!

***— Чаму вы навучыліся, працуючы побач з Міхаілам Фінбергам?***

— Мая артыстычная дзейнасць пачалася з аркестра і працягваецца ў ім. А з Міхаілам Якаўлевічам наш калектыў быў як за каменнай сцяной. Мы мелі магчымасць працаваць і больш ні пра што не думаць, хаця, вядома, існавалі і розныя праблемы, але ўсе яны вырашаліся. А пасля яго сыходу калектыву стала ўжо цяжэй існаваць. І цяпер я, напрыклад, вучуся жыць па-іншаму: больш праяўляю актыўнасці ў плане развіцця, сама думаю і за ўсё адказваю. Але працягваю працаваць так, як ён мяне вучыў. Раблю ўсё па праўдзе і на тым прафесійным узроўні, які Міхаіл Якаўлевіч нам паказаў. І спадзяюся, што гэты высокі ўзровень майстэрства, які ён нам прывіў і да якога мы прыйшлі з ім, застанецца ў нашым калектыве. Увогуле, мне хочацца на ўсёй нашай эстрадзе бачыць прафесійных і адукаваных артыстаў, каб яны былі не выпадковымі людзьмі. А што датычыцца нашага аркестра, то я заўсёды буду апорай у тым, каб падняць яго на новы ўзровень і захаваць усё, што было зроблена і дасягнута Міхаілам Якаўлевічам.

**«Нам з мужам з самага пачатку добра быць удваіх, і ніякага лішняга антуражу не хочацца. У нас якраз тая сітуацыя, калі, бывае, нават маўчаць побач камфортна. І адпачынак для мяне — гэта не паход у рэстаран, а калі проста вяртаешся дадому, гатуеш разам вячэру і дзеліш вечар на дваіх. І мы робім тое не дамаўляючыся, а проста інтуітыўна і па ўзаемным жаданні. Ці калі, вяртаючыся з канцэрта, я ведаю, што дома мяне чакаюць. Мы здольныя разумець адно аднаго без слоў. І таму вельмі добра, што мы сустрэліся».**

***— Вы ніколі не бачылі сябе па-за гэтым калектывам?***

— У аркестры я працую дзясяткі гадоў. І з Міхаілам Якаўлевічам мы так зблізіліся (кожны дзень стэлефаноўваліся, размаўлялі, раіліся), што проста нават не ўзнікала думкі змяніць нешта. Я ўвесь час працавала ў аркестры і паралельна займалася нейкімі сваімі сольнымі праектамі: песні запісвала, кліпы здымала. Зараз пасля перапынку думаю зноў вярнуцца да такой дзейнасці. Быў час, калі ўвогуле нічога не пісалася. Толькі сумныя думкі ўзнікалі, а ў музыцы хочацца зусім іншы настрой трансліраваць. Таму паціху выходжу з паўзы і буду працягваць тварыць.

***— Вы прыйшлі ў аркестр у 19 гадоў. Колькі часу спатрэбілася, каб уліцца ў калектыў, і ці давялося даказваць, што годныя быць яго салісткай?***

— Я, калі пайшла на праслухоўванне ў аркестр, нічога не ведала пра калектыў, бо была ўся ў акадэмічнай музыцы. Аднак калі жылі мы яшчэ ў Калінінградзе, то слухала і рок, і джаз. А паспрабаваць сябе як салістка вырашыла падчас вучобы. Я тады з'яўлялася студэнткай трэцяга курса харавога дырыжыравання музычнага вучылішча імя Глінкі (сёння гэта музычны каледж). Там сабраны выдатныя педагогі. Мая вялікая любоў — Яўгенія Адамаўна Дзягілева, якая аказала моцны ўплыў на мяне як на музыканта. Таму, трапіўшы ў аркестр, я была даволі ўпэўненай у сабе дзяўчынай, якая думала, што яна самая лепшая. Праспявала сваю ўласную песню, потым яшчэ выканала Гершвіна «Каханне ўвайшло» (помню, мне акампаніраваў народны артыст Андрэй Шпянёў, які працаваў тады ў аркестры), а пасля быў мастацкі савет, дзе я ўвогуле нікога не ведала. У выніку Міхаіл Якаўлевіч сказаў прыйсці праз два тыдні. Прыйшла, выступіла, а людзей — яшчэ больш у зале. І тады ўжо напружылася, але мяне ўсё ж узялі! Праўда, з умовай, што трэба яшчэ папрацаваць, перш чым ісці выступаць з аркестрам. Год я была вучаніцай заслужанай артысткі Тамары Раеўскай. Пасля яна мне падарыла сваю песню «Грэх», з якой я пайшла на конкурс «Маладзечна 94». А да гэтага была яшчэ складанейшая кампазіцыя Эдуарда Зарыцкага «Былая страта», і з ёй я ўпершыню выйшла на сцэну як салістка.

***— Як лічыце, сёння артыста вызначае прафесіяналізм ці супадзенне шэрагу іншых фактараў, накшталт пазнавальнасці, удачы і г. д.?***

— Усё мае аднолькава важнае значэнне. Таму што калі ў патрэбны час і ў патрэбным месцы ты не сустрэнеш сваіх людзей, то са сваім прафесіяналізмам можна застацца дома. У творчасці ўсё важна. Тыя ж сацыяльныя сеткі, дзе можна выкласці свае песні, — і аўдыторыя даведаецца пра цябе. Сама так нядаўна прадставіла там прома некаторых кампазіцый, і людзі пачалі пісаць «Якія песні!», а я ўжо даўно іх спяваю. Таму думаю, што ўсё ўзаемазвязана, але прафесіяналізм, у плане таго, што ты павінен адвучыцца прафільна, — абавязковы складнік. Глядзіце, рабіць аперацыі ніхто не спрабуе без адукацыі, а ў артысты ідуць. Ніколі не варта спыняць вучобу, бо толькі тады ты застанешся запатрабаваным у сваёй прафесіі.

**«Мая артыстычная дзейнасць пачалася з аркестра і працягваецца ў ім. А з Міхаілам Якаўлевічам наш калектыў быў як за каменнай сцяной. Мы мелі магчымасць працаваць і больш ні пра што не думаць, хаця, вядома, існавалі і розныя праблемы, але ўсе яны вырашаліся. А пасля яго сыходу калектыву стала ўжо цяжэй існаваць. І цяпер я, напрыклад, вучуся жыць па-іншаму: больш праяўляю актыўнасці ў плане развіцця, сама думаю і за ўсё адказваю. Але працягваю працаваць так, як ён мяне вучыў. Раблю ўсё па праўдзе і на тым прафесійным узроўні, які Міхаіл Якаўлевіч нам паказаў. І спадзяюся, што гэты высокі ўзровень майстэрства, які ён нам прывіў і да якога мы прыйшлі з ім, застанецца ў нашым калектыве. Увогуле, мне хочацца на ўсёй нашай эстрадзе бачыць прафесійных і адукаваных артыстаў, каб яны былі не выпадковымі людзьмі. А што датычыцца нашага аркестра, то я заўсёды буду апорай у тым, каб падняць яго на новы ўзровень і захаваць усё, што было зроблена і дасягнута Міхаілам Якаўлевічам».**

***— Калі азірнуцца на пражытыя гады, чаму вы вучыцеся ў бацькоў, вучняў, свайго акружэння?***

— Тата ў мяне ваенны. І кожны раз, калі мы збіраемся разам усёй сям'ёй, ён крыху пасядзіць з намі і бяжыць па справах. Даводзіцца ўгаворваць яго запаволіцца. Часам атрымліваецца. Бацька заўсёды быў на працы, у камандзіроўках, ён у мяне прафесар Расійскай ваеннай акадэміі. Зараз тату 82 гады, а ён усё яшчэ чытае вершы па памяці. І столькі ўсяго ведае, што я кожны раз не перастаю яму здзіўляцца. Маму я бачыла часцей, і, як малодшая дачка, увесь час праводзіла пераважна з ёю. Бачыла, як маці займаецца хатнімі справамі. У нас заўсёды было чыста, нагатавана, утульна, і таму я вырасла з любоўю да парадку і чысціні. Яшчэ мае бацькі — прыклад таго, як варта аберагаць сваю сям'ю. Нас, дзяцей, тата з мамай адмяжоўвалі ад усіх праблем. У мяне заўсёды было ўсё самае найлепшае, прычым я нават не ведала, адкуль яно бярэцца. Хаця жылі мы і ў гады дэфіцыту, калі, бывала, з мамай стаялі ў чарзе па прадукты. Але дома ў нас усяго было ў дастатку. Таксама пакаленне маіх бацькоў — гэта людзі, якія ўмелі цаніць час. А што датычыцца маіх вучняў, то ў іх я вучуся мабільнасці, яны натхняюць на тое, каб няспынна працягваць самаўдасканальвацца. У сваю чаргу Міхаіл Якаўлевіч многаму навучыў мяне як прафесіянал, а як чалавек ён для мяне прыклад пэўнай бескампраміснасці ў справах. Пры ўсёй знешняй сваёй строгасці ён быў светлы і адкрыты чалавек. І заўсёды ўмеў шчыра пажартаваць.

***— Вы па жыцці кіруецеся сэрцам ці розумам?***

— Сэрца заўсёды на ўзроўні інтуіцыі падказвае мне, куды рухацца. І ўвогуле трэба часцей да сябе прыслухоўвацца. Я хоць і аналізую нейкія моманты з пазіцыі логікі, аднак заўжды адчуваю, варта мне туды ісці альбо не. Калі адчуваю, як унутры нешта запальваецца, то разумею, што ўсё будзе добра, і згаджаюся. Любыя перамены ў сваім жыцці я прадчуваю загадзя.

***— І мужа інтуіцыя дапамагла вам разгледзець?***

— Так, бо з Ігарам мы сустрэліся абсалютна выпадкова. І адразу неяк пацягнуліся адно да аднаго. Я проста ўбачыла будучага мужа, і далей спрацавала ўжо нейкая хімія. Вядома, давялося прызвычайвацца да нейкіх момантаў, а ў астатнім з самага пачатку разумела, што знайшла свайго чалавека.

***— А штамп у пашпарце для вас меў значэнне?***

— Мы пражылі разам сем гадоў, а потым мая мама ўзняла гэтую тэму. І вяселле мы рабілі больш для гасцей, чым для сябе, але выдатнае свята атрымалася, бо госці — артысты, музыканты. Я проста неяк адразу ўсвядоміла, што з гэтым мужчынам для мяне ўсё сур'ёзна і надоўга. Штамп нічога не змяніў.

***— Замужжа змяніла ваш погляд на прафесію, улічваючы яе публічнасць?***

— Я чалавек свабодны, але ў паводзінах з іншымі ў мяне заўсёды ёсць межы. І муж прытрымліваецца такога ж меркавання. Напрыклад, ты можаш дазволіць сябе абняць, пацалаваць у шчаку, але не пярэйдзеш мяжы, дзе пазначана «стоп!»

***— Як лічыце, варта падсілкоўваць адносіны, калі за плячыма ўжо гады ў шлюбе?***

— Нам з мужам з самага пачатку добра быць удваіх, і ніякага лішняга антуражу не хочацца. У нас якраз тая сітуацыя, калі, бывае, нават маўчаць побач камфортна. І адпачынак для мяне — гэта не паход у рэстаран, а калі проста вяртаешся дадому, гатуеш разам вячэру і дзеліш вечар на дваіх. І мы робім тое не дамаўляючыся, а проста інтуітыўна і па ўзаемным жаданні. Ці калі, вяртаючыся з канцэрта, я ведаю, што дома мяне чакаюць. Мы здольныя разумець адно аднаго без слоў. І таму вельмі добра, што мы сустрэліся.

***— Вы артыстка, чалавек, які пастаянна ў кампаніі людзей. А як успрымаеце адзіноту?***

— Я люблю пабыць сам-насам, схаваўшыся ад навакольнага свету. Мая сям'я пераважна жыве за горадам, таму я на некалькі дзён магу заставацца сама ў нашай гарадской кватэры. Хаджу на бодзі-балет, займаюся сваімі справамі, перазагружаюся і сілкуюся энергіяй. Любога чалавека патрэбна час ад часу пазбаўляць сваёй прысутнасці. А потым зноў радавацца сустрэчы.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з архіва Наталлі ТАМЭЛА.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| Продавец | **ОАО «Сморгоньагросервис», ул. Тракторная, 64, 231000, г. Сморгонь** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**

| | |
|---|---|
| **Лот № 1 – мойка** (здание неустановленного назначения) общей площадью 250,3 кв. м, инв. номер 443/С-7562. Составные части и принадлежности: А2/к-мойка, ж-калитка, е-ворота, д-наружное ограждение, и-площадка, б-площадка. **Адрес:** Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Тракторная, 87. **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве аренды по 28.08.2070 г. общей площадью 0,7513 га для строительства и обслуживания мойки | **Начальная цена с НДС 20 %: 75 288,00 белорусских рублей** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» по адресу: г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **30** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **5 % от цены продажи** в течение 3 дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов: 10.00 **14.06.2023 г.**
Окончание торгов: 11.00 **14.06.2023 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **13.06.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| Контактные данные | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

## ЗДАНИЯ ХОЛОДИЛЬНИКА 100

*(составные части и принадлежности: теневой навес)*
**с инв. № 620/С-37423 общей площадью 375,9 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622250100001005464 (право аренды по 06.07.2120) площадью 0,4812 га по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Омельянюка, 5.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: природная территория, подлежащая специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), площадь 0,4738 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 170 419,70 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **17 041,00 бел. руб.**
*Начальная цена снижена на 15 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 24.02.2022, 05.05.2022.

Аукцион состоится **31.05.2023 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.05.2023 до 16.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (801716) 649-33, (8029) 578-35-46.**

УНП 600037767

Настоящим ООО «Реалконсалтинг»
СООБЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ИЗВЕЩЕНИЕ
(опубликовано в газете «Звязда» 27.04.2023)
о проведении повторного открытого аукциона № 05/22
(предмет аукциона: изолированное помещение
с инв. № 500/D-70784765, расположенное по адресу:
г. Минск, пр-т Независимости, 117А-9Т, площадь – 308,6 кв. м):

**Последним днем приема заявлений и внесения задатка для участия в аукционе следует считать 19.05.2023 до 17.00, аукцион состоится 23.05.2023 в 11.00.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33. Тел. +375 (17) 363-99-40 |

| Извещение о проведении открытого аукциона | Дата, время проведения аукциона | Срок подачи заявления на участие в торгах |
|---|---|---|
| **Предмет аукциона:** изолированные помещения, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/1-1, 33/1-2, 33/1-3. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by | **29.05.2023 в 14.00** | **с 9.00 13.05.2023 до 17.00 26.05.2023** |

**Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** Лица, желающие принять участие в аукционе обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **15 (пятнадцати) дней** со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов не менее чем за день до наступления даты проведения торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Контактные данные | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – **ЗАО «КОПИЛЭНД»** (УНП 101055472 , г. Минск, ул. Гурского, д. 31, оф. 1н).

***Дата и время проведения торгов:*** **13 июня 2023 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 13 мая 2023 года по 12 июня 2023 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** **ЗАО «КОПИЛЭНД» (УНП 101055472**) в лице ликвидатора – директора ООО «Консалтинговая группа «ПРАВО» Мамедовой В.О.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интеренет-сайте http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Строительному унитарному предприятию «Гродненская СПМК»**

**Аукцион состоится 13.06.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129462 (назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – покрытие автодрома), общей площадью 2 425,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000001010570, площадью 0,2848 га (назначение – земельный участок для обслуживания сооружения специализированного транспорта), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4. Лот 1 имеет обременения со стороны 3-х лиц в виде аренды части асфальтобетонного покрытия, площадью 90,0 кв. м, сроком по 31.12.2023 г. Начальная цена продажи лота – 350 000 руб. (триста пятьдесят тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 35 000 руб. (тридцать пять тысяч рублей). Условия проведения аукциона – условия оплаты: оплата полной стоимости объекта недвижимости производится не позднее 15 (пятнадцати) банковских дней с момента заключения договора |
| **Начальная цена продажи** | 350 000 руб. (триста пятьдесят тысяч рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 35 000 руб. (тридцать пять тысяч рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 09.06.2023 г. до 15.00** |
| **Условия проведения аукциона** | Условия оплаты: оплата полной стоимости объекта недвижимости производится не позднее 15 (пятнадцати) банковских дней с момента заключения договора |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона, – https://grino.by/auktsiony/

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «МИНСКРЕМСТРОЙ»** (Продавец)

Аукцион состоится **31.05.2023 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1 в составе:

**1. ЦЕХ САНТЕХНИЧЕСКОЙ ЗАГОТОВКИ, инв. № 500/С-48671, 1035 кв. м;**
**2. КРАН-БАЛКА, грузоподъемность 2 т.**

Адрес лота: г. Минск, ул. Железнодорожная, 37/6.
Начальная цена с НДС 20 % – 975120,00 руб.
Задаток – 100000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.
Земельный участок 500000000005007051, 0,7197 га.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 29.05.2023 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор электронных торгов**: Дукорский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Дукора, ул. Речная, 14, тел.: (801713) 63935, 31622, 31636, 8 (029) 2424313.

**Оператор электронной торговой площадки**: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Электронный адрес электронной торговой площадки**: www.et.butb.by

Дата проведения электронных торгов: **14 июня 2023 года**

**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) | Расходы по подготовке документации (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Минская область, Пуховичский р-н, аг. Дукора, пер. Трудовой, уч. 13** | 624483402101001714; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1497 | Сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения | 18 000,00 | 1800,00 | 1717,06 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| **Минская область, Пуховичский р-н, д. Молоднево, 6А** | 624483402101001715; строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 0,1500 | Сети электроснабжения | 5000,00 | 500,00 | 1741,40 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. Назначение платежа: внесение суммы задатка на участие в торгах. Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – 09 июня 2023 года до 15.00.

